НАША НІВА

КУЛЬТУРА, ПАЛІТЫКА

выходзіць у панядзелкі

№ 23 (61)
2 верасьня 1996 г
панядзелак

ТЭЛЕПРАГРАМА
БІРЖА ПРАЦЫ

Артыкул №13

АПУБЛІКАВАНЫ ПРАЕКТ НОВАЙ КАНСТЫТУЦЫІ КРАІНЫ

Праект Канстытуцыі, прапанаваны А.Лукашэнкам ды надрукаваны ў мінулую суботу ў газэтах, нагадвае аповеды пра фальклёрных герояў. Прэзыдэнт і Нацыянальны сход з Сэнатам распускае, і выбары ды рэфэрэндумы прызначае, і палову чальцоў Цэнтральнай Выбарчай Камісіі ды Канстытуцыйнага Суда сам абірае, і сьняты абвяшчае, і...

Дэталізацыя правоў прэзыдэнта дасягнула такога ўзроўню, што ў Канстытуцыю ўключаюцца палажэньні, якія рэгулююцца спэцыяльнымі законамі й ня мусяць быць у Асноўным законе. Затое гэтыя палажэньні адлюстроўваюць сёньняшнім палітычным інтарэсам рэжыму. Да прыкладу, у адпаведнасьці з пунктам 21 артыкула 84 прэзыдэнт хоча сам без суда забараняць страйкі. Паводле прапанаванага праекту, прэзыдэнт РБ апынаецца над заканадаўчаю й іншыя дзяржаўныя органы й інстытуцыі паўплываць на яго практычна ня могуць. Дзяржава, як гарантаваныя, суверэнны саюз грамадзянаў, утвораны з мэтаю абароны жыцьця, свабоды й маёмасьці, распадаецца, пакідаючы месца толькі дзяржаўнай уладзе аднаго чалавека. Вось чаму ўжо апошні раздзел прапанаванае Канстытуцыі пад назвай «Заключныя й пераходныя палажэньні» нагадвае хроніку дзяржаўнага перавароту. Там распісана з дакладнасьцю да месяца, як калі, пад якімі лёзунгамі прэзыдэнт выпрачае найвышэйшую заканадаўчую й прадстаўнічую ўладу Беларусі сёньняшні Вярхоўны Савет.

Беларусь на бачувесціна парламэнту. Пасярэдні Палата прадстаўнікоў вынесьці вотум недаверу ўраду альбо два разы адмовіцца адкрыць Прэм'ер-міністра, прэзыдэнт зараз жа распусьціць ніжнюю палату Нацыянальнага сходу. Вышэйшую палату Савет абіраюць мясцовыя Рады дэпутатаў, дзе пераважаюць прызначэнцы «вэртыкалі». Трацінa «сэнатараў» увогуле прызначаецца прэзыдэнтам.

Некаторыя канстытуцыйныя прапановы можна было б расцаніць як прымальныя. Сапраўды варта падумаць пра паўнамоцтвы Ураду. Практыка існаваньня двухпалатных парлямэнтаў, калі вышэйшая палата ўздзейнічае на сябе і прэзыдэнцкае прадстаўніцтва, у сьвеце вядомая. Вышэйшыня саслоўна-прадстаўнічы орган Вялікага Княства Літоўскага таксама быў двухпалатным і складаўся з Рады і Сойму. Але ў сёньняшніх умовах двухпалатнасьць Нацыянальнага сходу — гэта толькі модныя дэкарацыі сцэны трагічнага спэктаклю. Дэкарацыі, якія, апроч іншага, мусяць у сваіх канструкцыях з прыслонкамі старой і новай аўтарытарнай Канстытуцыі прыхаваць самы галоўны артыкул №13 — пра ўласнасьць.

Пры ўсёй антырынкавай рыторыцы А.Лукашэнкі рэжым рыхтуецца да аўтарытарнай мадэрнізацыі. Артыкул 13 у прапанаванай вэрсіі выглядае больш рэфармісцкім у параўнаньні зь яго старой рэдакцыяй у беларускай Канстытуцыі, бо тут вельмі выразна акрэсьліваецца існаваньне прыватнай уласнасьці, падтрымка прадпрымальніцтва, намер пераводу дзяржаўную ўласнасьць у прыватную. Падобна, што спраўджваюцца нашы прагнозы пра падрыхтоўку пад канец году прыватызацыі дзяржаўнае маёмасьці. І самае галоўнае — кола ўладальнікаў ужо вызначана. Гэта й ёсьць адзін з галоўных імпульсаў нападаў на беларускую Канстытуцыю й замену яе сурагатам з кавалкаў ранейшае Канстытуцыі й народных казак.

Але сумневы ў посьпеху новага прадпрыемства не зьнікаюць. Хто рэалізатар рэформаў, хто дарадца? Вечаовы імпульсіўнасьць галоўнага актора, бачачы ўзровень ягонага асяродку, дзе за галоўны палітычны посьпех уважаюцца вульгарныя напады на незалежныя газэты й радыёстанцыі, мы можам канстатаваць: «прыняцьце» гэтае «Канстытуцыі» толькі паглыбіць сыстэмны крызыс. Бо парлямэнцкія працэдуры для таго й выпрацаваныя, каб у дыскусіях напрацоўваць найбольш прымальныя для большасьці варыянты развіцьця грамадзтва, улічваючы пры гэтым інтарэсы меншасьцяў. Толькі пабудаваныя на такіх прынцыпах рэформы могуць мець посьпех. Эгаістычнае імкненьне ўзбагаціцца толькі самому, не зважаючы на праблемы іншых людзей, прыводзяць да ...

Алег Дзярновіч

Сямен Шарэцкі

Я сеў за адзін стол з БНФ

Напярэдадні 2 верасьня, дня адкрыцьця чарговай сэсіі Вярхоўнага Савету, карэспандэнт «Нашай Нівы» Алег Дашкевіч узяў інтэрвію ў старшыні ВС Сямёна Шарэцкага. Гутарка адбылася якраз пасьля прэс-канфэрэнцыі сьпікера, якую С.Шарэцкі склікаў, каб пракамэнтаваць атрыманы ім «амэрыканскі ліст».



С.Шарэцкі: ... Безумоўна, гэта правакацыя. Дарэчы, ня першая. Была гаяндзкая «сука». Так і цяпер — правакацыя супраць мяне.

«НН»: Калі робяцца правакацыі, мусіць гэта камусьці трэба?

Працяг на старонцы ...

МІЖНАРОДНЫ КАМЭНТАР

Доўгая сьмерць камунізму

Амаль усе камуністычныя партыі сьвету раскалоліся на дробныя групоўкі. У эпоху камутараў, Інтэрнэту і AIDS'у сьмешна чуць пра класавую барацьбу. Тым ня менш, вялікая частка эўрапейскіх інтэлектуалаў прасьвядае мроіць пра сусьветную рэвалюцыю і бурнымі воплескамі сустрэла выступленьне ў Мэксыцы ахвочага на змаганьне «камандантэ» Маркаса, новага Чэ Гевары. А ў Сеўле сталічныя студэнты ... за ўзьяднаньне поўначы з поўднем краіны.

Працяг на старонцы ...

Навіны 1-м сказам

навіны 1-м сказам

РАДЫЕ. З 1 верасьня ... папулярнага менскага радые 101,2 FM.

ПРАВІЛЫ. 1 верасьня у Беларусі пачалі дзейнічаць новыя правілы дарожнага руху, гэта першыя уласна беларускія правілы, да таго ж наблізжаныя да эўрапейскіх стандартаў.

АКЦЫЯ. Сёньня (2 верасьня) у 17.00 адбудзецца сустрэча дэпутатаў розных фракцыяў ВС з выбаршчыкамі. Запланаванае месца сустрэчы — плошча Незалежнасьці.

ГРЫЎНА. З 2 верасьня на ... у абарачэньні новая нацыянальная валюта — грыўня, якая будзе абменьвацца паводле курсу 1 грыўня за 100 тыс. старых ... ($1 роўны 1,76 грыўні). Грыўня складаецца з 100 капеек.

КАТАСТРОФА. У выніку катастрофы расейскага самалета Ту-154 на ... востраве Шпіцбэрген загінулі ўсе пасажыры — 141 чалавек.

ПАКАРАНЬНЕ. У Паўднёвай Карэі ... у часе ... дыктатарскага кіраваньня ... былыя прэзыдэнты краіны Чон Ду Хван, які прысуджаны да сьмяротнага пакараньня, і Ро Дэ У, які ... прызначана ... вынесеныя прысуды.

КЛІНТАН. У ЗША адбыўся зьезд Дэмакратычнай партыі, які ... дзейнага прэзыдэнта ЗША Клінтана ... кандыдатам ... прэзыдэнты краіны.

СУПРАЦЬ МАНАРХІІ. Вынікі ... грамадзкай думкі ... Вялікабрытаніі паказалі, што 52% брытанцаў лічаць, што ... Эліжабэт павінна стаць апошняй брытанскай каралевай.

ЗА ДЗЯЦЕЙ. У Швэцыі пры ўдзеле прадстаўнікоў ... краінаў адбыўся першы ў гісторыі сусьветны кангрэс супраць камэрцыйнай сэксуальнай эксплёатацыі дзяцей.

ПАКАРАНЬНЕ II. У амэрыканскім штаце ... упершыню ... ЗША быў прыняты закон пра ... кастрацыю гвалтаўнікоў дзяцей, якія зьдзейсьнілі злачынства ... раз.

ЗАПРАШЭНЬНЕ. Парлямэнцкая асамблея Рады Эўропы запрасіла выступіць на сваёй сэсіі Аслана Масхадава ды Аляксандра Лебедзя.

АРАФАТ. У сувязі з рашэньнем ізраільскага ўраду аднавіць буйнамаштабнае будаўніцтва на Заходнім беразе ракі Ярдан і агульным жорсткай палітыкай Ізраілю у дачыненьні з палестынцамі, лідэр ААП Ясір Арафат прыгразіў аднаўленьнем ... ня так даўна агульнапалестынскай антыфады.

НАПРУЖАНАСЬЦЬ. Ірак увёў 40 тыс. сваіх войскаў разам з 3 танкавымі дывізіямі ды цяжкой артылерыяй у населеную курдамі паўднёвую частку краіны, што выклікала прывядзеньне у павышаную баявую гатоўнасьць размешчаных на Блізкім Усходзе войскаў краін NATO.

АПЫТАНЬНЕ. Паводле сацыялягічнага апытаньня, праведзенага Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў, 21,3% беларусаў лічаць сябе беднымі, 39,2% — ніжэй сярэдняга ўзроўню, 36% — на сярэднім, 2,3% — вышэй сярэдняга, 0,3% лічаць сябе багатымі.

НАША НІВА. Наступны нумар Нашай Нівы выйдзе у панядзелак 16 верасьня.

Віктар Шалкевіч

Уся сям'я слухала "Вольную Эўропу"...

Nicht kapituliren!

Віктар Шалкевіч, які сёньня жыве ў Горадні, вельмі хутка пачынаецца ад шараговага жаўнера Вэрмахту да афіцэра. Ён паўмячаць якую імкліраму сваёй вайсковай кар'еры колішнім вялікім поспехам на немцаў, які пачалаў напярэдадні 40 гадавіна слаўнай перамогі. Кінарэжысэры станалі: немцаў, немцаў, чым болей лепей нам фрыцаў. Шалкевіча запрашалі ахвотна. Так сьціпла пачаўшы ў 1979-ым у эпізодзе з народным артыстам Віктарам Тарасавым (фільм "Дзень вяртаньня") сваю нямецкую кар'еру, ён апынуўся у небясьпецы назаўжды застацца немцам. Аднак зь цягам перабудовы попыт зьменшыўся, пачалася дэмілітарызацыя, канцэрсія, Варшаўскі дагавор быў пахаваны, а наш Шалкевіч скінуў абрыдлыя наплечнікі. А неўзабаве зьявіўся ў фільме Ігара Вовчак "М... асы", які рабіўся ў Горадні. Потым былі "Сьлёзы блуднага сына" Віктара Асьлюка, дзе Шалкевіча брыткія беларусы расстрэльваюць як чырвоных то маскалі, то свае, і потым ... Чэнэй бы застаўся немцам ... "прыпадзіць"

Я глядзеў фільм Асьлюка (ён прызы у Кіеве і Менску) і быў уражаны, наколькі твар Шалкевіча нагадвае Вітаўта зь вядомай грунвальдзкай карціны Яна Матэйкі, на якой у адным месцы засяродзілася кінакамэра. І, мабыць, ня я адзін зьвярнуў на гэта ўвагу. Віктар неўзабаве зьявіўся у ролі Жыгімонта Аўгуста II — караля польскага і вялікага князя літоўскага (фільм Віктара Турава "Салодкі яд каханьня"...

Працяг на старонцы ...

Новы стаіцызм

Ігар Бабкоў

*Ж*ыцьце зноу пачало гарчыць, недзе зь вясны, калі безнадзейнасьць дасягнула максымальнага пункту, калі пачаўся рэальны супраціў. «Што рабіць?» — пытаюцца сябры, знаёмыя прыяцелі. Пытаньне з прысмакам хініну, як быццам падчас усеагульнай ліхаманкі, ад якой мы абавязкова мусім выратавацца. Пытаньне для саміх сябе, амаль што без пытальнага знаку напрыканцы, пытаньне як спускавая кнопка, пасьля якой як у калейдаскопе: дэманстранцы, змаганьне, амон. Снайпэры гранатамёты Героі, здраднікі.

Зрэшты, усе, хто пра гэта пытаюцца, і так нешта робяць. Таленавітыя журналісты, бізнэсмэны, літаратары. Яшчэ ніколі яны так шмат, так эфэктыўна не рабілі. Яшчэ ніколі рэсурсы іхняга таленту не былі такія вялікія, — і такія магчымыя Адкуль тады пытаньне? Чаму усе пытаюцца, што рабіць?

Магчыма, усе нарэшце адчулі, што жывуць у рэальнай краіне. Са сваім лёсам. Лёсам, які закранае нас усіх Разам. Які творыць з нас калі и ня нацыю, дык хаця б супольнасьць. Што гэта нашыя гады праходзяць у гэтым калектыўным пост-савецкім трызьненьні, якім ёсьць сёньняшняя Беларусь. Гэта нам даводзіцца зноў бачыць прадажныя пысы, лісьлівыя вочкі і гебэльсаўскую рыторыку калябарантаў рэжыму. І ўсе раптам зразумелі: пытаньне ня ў тым, што будзе зь імі (лукашэнкамі, электаратамі, трактарамі, рэйтынгамі, сяўбой), а ў тым, што будзе з намі

Неяк аднолькава, у Менску ці Будапэшце Варшаве ці Брусэлі людзі ад улады нас пераконваюць: вы — танюсенькая праслойка эліты, а вось народ — за лукашэнку (варыянты — узьяднаньне з Расеяй, супроць дэмакратаў, супроць рынку й г.д.) Вы — маргіналы кажуць яны і праходзяць побач, спрабуючы не заўважыць, адсунуць, маргіналізаваць. Напраўдзе, што будзе з намі, «з гэтай танюсенькай праслойкай»?

Мы ня мусім даць падмануць сябе гэтай лёгікай. Гэта лёгіка нігілізму у самым брутальным сэнсе. Адзін свабодны чалавек важыць на вагах гісторыі больш чым сотня тысячаў рабоў Адзін талент важыць на вагах жыцьця невымерна больш, чым сотня тысячаў бяздарнасьцяў.

А што ён можа, ваш вольны чалавек, — адказваюць нам. Хіба ён можа зьмяніць што-колечы ў гэтым трызьненьні, якое само сябе «выбрала»? Ці не прасьцей шчыра прызнаць, што вы памылiліся з народам, з краінай, з часам і прасторай? Ці не прасьцей зьехаць, эміграваць? Ці вы хочаце правесьці лепшыя гады жыцьця сярод савецкага плебсу даптаныя да ўлады?

Я ня ведаю, што адказаць на гэтыя пытаньні. Ці, лепш сказаць, мне нават ня хочацца адказваць. Я адчуваю гэтую лёгіку, гэтыя пытаньні як новую спакусу, — і новую пастку. Я маю патрэбу сфармуляваць (для самога сябе) — для чалавека які не зьяжджае — новы этас і новую эстэтыку — культурнае апазыцыі й культурнага супраціву

Назавем гэта новым стаіцызмам

Рэч у тым што напрыканцы дваццатага стагодзьдзя абгрунтаваць анталягічна якую-колечы этыку (ня кажучы ўжо пра эстэтыку) немагчыма Асабліва этыку якая ўсьведамляе сябе насуперак галоўнай плыні. Як этыка апазыцыі. Можна зрабіць выбар у кірунку уласнай свабоды але немагчыма абгрунтаваць свабоду, асабліва для тых, хто ніколі не адчуваў ейнага паху

Так, этыка апазыцыі — гэта ўласны, экзыстэнцыйны выбар свабоды ў сытуацыі, калі бальшыня згодная да выбару новага рабства. Гэта выбар бескампраміснага тут-існаваньня, калі бальшыня пачынае паціху ўсьведамляць вартасьць новых кампрамісаў.

Рэч яшчэ і ў тым, што беларуская культура аніколі не выбірала менавіта свабоду. Выбіралася перш за ўсё Беларусь, а ўжо якая яна — гэта праблема другога гатунку. Будзе Беларусь а ўсё астатняе прыдасца Не прыдаецца У выніку адбылася карозія вартасьцяў Рэжым Лукашэнкі толькі й мог паўстаць у краіне, у якой адна частка насельніцтва выбірае Беларусь без свабоды, а другая свабоду безь Беларусі. Рэжым Лукашэнкі — гэта прарыў на паверхню падсьвядомасьці Беларусі, даўгі час рэпрэсаванай, загнанай на ўзровень плебсу раз бэшчанай і небясьпечнай. Яе ўжо немагчыма загнаць назад Яе ўжо немагчыма пераканаць у вартасьці нейкіх правілаў гульні, у тым што яна мусіць, альбо ёй выгадна рабіць нешта. Яна адразу адчувае гэта як слабасьць.

Цень немагчыма зьнішчыць аргумэнтамі на карысьць ейнай нявартасьці. Яна зьнікае ў выніку прысутнасьці сьвятла.

А хто вы зрэшты такія, — пытаюцца ЯНЫ — каб лічыць сябе «сьвятлом»? Ці ня сьмешна ўсё гэта? Ці не завысока вы сябе ставіце?

Мы разумеем, хто мы такія калі робім свой выбар. Калі мы верым у свой выбар Магчыма, ад усіх гэтых часоў толькі й застанецца ў памяці цыкль вершаў, турэмны дзёньнік ды недапісаны раман. А зусім ня той, хто «хоча зрабіць сваё трызьненьне сном многіх».

Можна толькі ад-стойваць і выстойваць. Сваё наймэньне стоікі атрымалі цалкам выпадкова, ходзячы падчас развагаў між калёнамі. Цалкам выпадкова ў беларускай мове слова стаіцызм вядзе за сабой гэты шэраг: стаяць, выстаяць, адстаяць. Перш за ўсё адстаяць саміх сябе. Свой выбар. Сваю свабоду.

"Наша Ніва" незалежны тыднёвік НАША НіВА

заснаваны ў 1906
адноўлены ў 1991

заснавальнік і выдавец	Павал Жук
рэдактар	Сяргей Дубавец
адказны сакратар	Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар	Сяргей Харэўскі
навіны	Уладзімер Барановіч
рэдактар дадатку "Інфарматар"	Андрэй Лапценак
макет	Віктар Корзун
дызайн і вёрстка	Лявон Раманчык
набор	Тацяна Чуйвід
стыль	Антон Кузьміч
карэктура	Сяргей Смаатрычэнка
пры ўдзеле	Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі у Гомелі	Зьміцер Бартосік (тэл 56-94-36)

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 239-78 49
E-mail: edit@niva.minsk.by
Падпісны індэкс 63125

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі перыядычнага выданьня № 581 ад 4-га лiпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусь Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.

Працяг са старонкі 1.

С.Ш.: Я ня ведаю, каму гэта выгадна бо ня ведаю, хто гэтую правакацыю зрабіў. Я падаў пісьмовую заяву ў дзяржаўныя органы, каб яны высьветлілі, хто гэта зрабіў і каб прынялі нейкія меры. Якая ж гэта дзяржава, калі чалавека можна абразіць правакацыяй на яго пісаць?. Гэтак сама ўсё пачыналася і калісьці. А дайшло да таго, што толькі ў магілёўскай вобласьці з дваццатага да трыццаць восьмага году было рэпрэсавана дзьвесьце тысяч чалавек. Вось па такіх паперках, па такіх лістах, які я сеньня атрымаў. Я абвінавачваюся ў тым што нібыта нейкія амэрыканскія кампаніі мяне фінансуюць для таго, каб я праводзіў праз Вярхоўны Савет нейкую падрыўную дзейнасьць у дзяржаве.

«НН»: Ці зьяўленьне такога ліста напярэдадні чарговай сэсіі нейкім чынам паўплывае на ўзаемадачыненьні паміж заканадаўчай і выканаўчай уладамі?

С.Ш.: Думаю, што нашы дэпутаты разумнейшыя, чым гэты правакатар. Я ня думаю, што ў нашай выканаўчай уладзе ёсьць настолькі прымітыўныя людзі, якія б маглі паверыць гэтай «ліпе». Дарэчы, пісал ліст дзевятнаццатага, адпраўлялі дваццаць трэцяга. Пісалі, я думаю, у Менску, адпраўлялі у Варшаве. Чакалі чатыры дні, адправяць ці не

«НН»: Пра што, на Вашую думку сьведчыць ігнараваньне прэзыдэнтам «круглага стала» прадстаўнікоў партый і прафсаюзаў?

С.Ш.: Пра гэта трэба спытаць у прэзыдэнта. Я толькі магу сказаць, што я пайшоў на «круглы стол» і сеў разам з БНФ таму што бачу, ёсьць большы вораг. З БНФ мы разыходзімся ў нейкіх пытаньнях, і я гэта кажу я крытыкую іх. І яны са мною ня згодныя. Але справа у тым што законы пачалі парушацца кожны дзень. Дарэчы, калі зьявіліся такія правакацыі, як гэтая супраць мяне, то чаго далей чакаць? Канцлягера? Таму ўсіх, хто прыйшоў і сеў за круглы стол, аб'яднаў адно клопат пра будучыню супраціў прававаму «беспрэдзелу», які мы бачым сеньня ў краіне.

«НН». Чаму ранеи дэпутаты гэтага «беспредела» быццам не заўважалі?

С.Ш.: А што яны павінны былі прыйсьці і адразу браць сякеру? Яны ж спрабавалі наладзіць працу Вярхоўнага Савету, узаемаадносіны з выканаўчай уладай і ўсе рабілі дзеля гэтага Яны ж самі не парушалі ніякіх законаў А там, дзе законы парушаліся... На тое ёсьць Канстытуцыйны Суд. І ён адзначыў шаснаццаць парушэньняў Канстытуцыі з боку прэзыдэнта.

«НН»: С.Багданкевіч на «круглым стале» казаў пра тое што сытуацыя у краіне блізкая да канфлікту што, на ягоную думку, вельмі верагодны разгон Вярхоўнага Савету. Як вы лічыце, гэткі варыянт разьвіцьця падзеяў магчымы?

С.Ш.: Я ня ведаю, я ня думаю, што дойдуць да такой ашалеласьці, што будуць разганяць Вярхоўны Савет які не парушае ніякіх законаў.

«НН»: Спадар Шарэцкі, некаторыя сьцьвярджаюць, што Вы пачуваецеся больш рашучым, вольным у выказваньнях, калі побач няма прэзыдэнта.

С.Ш.: Ну гэта так хацелася б правакатарам Я выказваюся вольна тады, калі ёсьць прэзыдэнт. Сеньня ж ён ёсьць а мы з вамі гаворым.

«НН»: Як вы лічыце, чаму прэзыдэнт ня хоча прыходзіць на сэсіі ВС?

С.Ш.: Ну, гэта трэба ў яго спытаць. Вось вы як лічыце, чаму?

«НН»: Пэўна, трымаючы пры сабе дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі і фінансуючы сілавыя структуры, ён можа сабе гэта дазволіць

С.Ш.: Ну, думайце так. Але ж ён абавязаны ісьці ў Вярхоўны Савет, таго патрабуе Канстытуцыя. Ён абавязаны ісьці, таму што толькі Вярхоўны Савет вызначае ўнутраную і зьнешнюю палітыку нашай дзяржавы. Ён павінен ісьці і дакладваць гэтую палітыку.

«НН»: Канстутыцыйны Суд адзначыў шаснаццаць парушэньняў Канстытуцыі ўказамі прэзыдэнта Гэта сьведчыць пра абсалютную няўвагу зь яго боку да дзяржаўных інстытутаў

С.Ш.: Ізноў жа, гэта трэба у яго запытаць, чаму ён так робіць.

«НН»: Спадар Шарэцкі, вы родам зь мястэчка Лаўрышава, вы зямляк слыннага пэрсанажа беларускай гісторыі Вялікага князя Воишалка. Вы зьбіраліся ушанаваць ягоную памяць на радзіме...

С.Ш.: Першага верасьня помнік Войшалку будзе адкрыты. Ён ужо стаіць. Я буду прысутнічаць на адкрыцьці

Дзе ляжыць Беларусь?

Дыскусіі вакол прызначэньня новага польскага пасла

Надзвычаи доўгую, большую, за год адсутнасьць польскага пасла у Менску можна ацаніць як прыкмету складаных адносінаў паміж дзьвюма суседнімі дзяржавамі, а таксама як рэакцыю на таксама доўгую адсутнасьць беларускага пасла у Варшаве пасьля зьняцьця Георгія Таразевіча. Ня так даўна сп. Бурскі заняў месца гаспадара ў рэзыдэнцыі беларускага пасла на вул. Атэнскай, а 27 жніўня гэтага году сэймавая камісія замежных справаў нарэшце абмеркавала кандыдатуру польскага пасла ў Беларусі.

Гэтае абмеркаваньне адбывалася у досыць камэдыйнаи абстаноўцы и нагадвала невялічкую рэпрызу. Усе пачалося якраз тады, калі прадстаўленая міністрам замежных справаў Дарыюшам Расаці кандыдатка на пасаду пасла Эва Спыхальска адчытала з паперы невялічкі рэфэрат на тэму Беларусі. Апроч усяго іншага, спадарыня кандыдатка сьцьвердзіла, што яна едзе «у краіну, якая ляжыць паміж Бугам і Одраю». Вось пасьля гэтых словаў дэпутат сэйму ад правай Канфэдэрацыі Незалежнаи Польшчы (KPN) заявіў: «Межы шаленства пяройдзены!» Па сьлядах абмеркаваньня Gazeta Wyborcza 28 жніўня надрукавала мапку з красамоўным загалоўкам: «Дзе ляжыць Беларусь».

Адной з найбольш дыскусійных праблемаў на сэймавай камісіі быў фактар беларускае мовы, якой Эва Спыхальска ня ведае. Дэпутатка ад ліберальнай Уніі Свабоды (UW) прызнала што паслу ў Менску даста кова ведаць расейскую мову але падкрэсьліла: «Ветлівым жэстам адносна Беларусі было б накіраваньне пасла, які ведае афіцыйную мову гэтай дзяржавы». Тут ужо дэпутаты ад урадавай партыі Саюзу Дэмакратычнай Лявіцы (SLD) пачалі прыводзіць свае аргумэнты, маўляў, «ня ўсе грамадзяне Беларусі ведаюць беларускую мову «ніводзін з кіраўнікоў Беларусі ня ведае беларускай мовы». У адказ, як зазначыла Gazeta Wyborcza, дэпутат ад Польскай Народнай Партыі (PSL) — саюзніцы Лявіцы ва урадзе — закрычаў: «20 працэнтаў людзеи размаўляюць у Беларусі пабеларуску! Трэба ведаць сытуацыю а не распавядаць казачкі!» «Моўная» дыскусія скончылася абяцаньнем спн. Спыхальскаи вывучыць беларускую мову ў Менску.

Далей спрэчкі паміж дэпутатам ад урадавых партыяў і ад апазыцыі працягнуліся на тэму палітычнай місіі польскага пасла у Беларусі Лібэралы з Уніі Свабоды мяркуюць, што ў Менску патрэбны чалавек зь вялікім палітычным і дыпляматычным досьведам, каб умець захоўваць адносіны як з прэзыдэнтам Беларусі, так зь беларускай апазыцыяй Дэпутаты Лявіцы сьцьвярджаюць што новы пасол мае палітычны досьвед

Эва Спыхальска нарадзілася у 1949 г. у Варшаве. Адвучыўшыся у Будаўнічым тэхнікуме, яна распачала сваю кар'еру партыйна-грамадзкага дзеяча ПНР, скончыўшы Аддзяленьне паліталёгіі Акадэміі грамадзкіх навук пры ПАРП. З 1969 г занялася прафсаюзнай дзейнасьцю. Кароткі пэрыяд брала ўдзел у «Салідарнасьці». З 1991 г да прызначэньня ў Менск была Старшыней Агульнапольскіх прафсаюзаў (OPZZ).

Паводле вынікаў галасаваньня у Камісіі, нягледзячы на тое што апазыцыя галасавала супраць, спн Эва Спыхальска была зацьверджана на пасаду пасла Засталося дачакацца толькі указу прэзыдэнта Квасьнеўскага. Вядома што такі ўказ ён мае намер падпісаць

Адначасова з паслом у Менск зацьвярджалася кандыдатура пасла у Маскву. Гэты сюжэт выглядаў абсалютна ідылічным у параўнаньні з дыскусіямі вакол кандыдатуры спн. Эвы Спыхальскай, бо прызначэньне Анджэя Залуцкага было дасягнута у выніку палітычнага торгу паміж урадавымі партыямі у выніку якога PSL атрымала пасаду намесьніка міністра замежных справаў

Дыскусіі у польскім сэйме вакол прызначэньня пасла у Менск сьведчаць пра важнасьць беларускага напрамку для польскай дыпляматыі й польскіх палітыкаў. Але сеньняшнюю польскую сытуацыю характарызуе таксама тое, што на дыпляматычныя пасады прызначаюць паводле партыйных прыкметаў. Пры зьмене цэнтральнаи улады будзе зьменены и пасол.

У Менск едзе пасол якая мае прагматычны досьвед прафсаюзнага жыцьця у стане паразумецца зь левымі палітыкамі. Адначасова «жаночая лінія» польскаи дыпляматыі будзе працягнута Але першага польскага пасла Эльжбэту Смулэк мы запомнім як прафэсійную беларусістку.

Алег Дзярновіч

arbor БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКАЕ СУМЕСНАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА

Распрацоўка і рэалізацыя праектаў:
інтэр'еры офісаў, гандлёвых памяшканьняў
фасады будынкаў
- візуальная рэкляма любой складанасьці
- паліграфія

NEW

220050 Менск, К.Маркса, 21а тэл./факс 226-06-95

Шэрыя расейскія палкоўнікі ёсьць, а БНА-БНСО няма

Ці таму, што я зь Берасьця ці таму, што я сам «замінаў руху аўтатранспарту 26 красавіка», для мяне галоўная падзея нашага супольнага жыцьця на мінулым тыдні — суд над сямю украінцамі, ахвярнымі казламі нашае веснавое міні-рэвалюцыі.

Упершыню з украінскімі нацыяналістамі-радыкаламі я сутыкнуўся ў 1993 годзе на сусьветным кангрэсе студэнтаў-украінцаў у Кіеве. Каб правесьці любае ім рашэньне, а іх на зьезьдзе было зусім няшмат — яны, усе дружна, у сваёй чорнай уніформе станавіліся ў два шэрагі за ўваходам ва «Украінскі дом». Праходзячы між маўклівымі шэрагамі, дэлегаты і госьці атрымлівалі іхнія ўлёткі праграмы. Рабілася страшнавата.

Пасьля, рыхтуючы дыпломную працу, я цішком сьмяяўся з палітычнай і эканамічнай праграмы УНА УНСО, гэткай колі з праграмаў пабудовы карпаратыўных грамадзтваў і дзяржаўных імпэрыялізмаў дваццатых гадоў.

Але сеньня, калі я бачу фотакарткі сямі змардаваных хлопцаў за кратамі... Я ўсё думаў: як так, што дзясятак камэраў да дробязяў зафіксавалі, як перакульваюцца машыны, а слаўныя органы так і не змаглі устанавіць, чые ж рукі пацягнуліся да трох сіратлівых легкавікоў? Ці не таму, што іхнія ж перакульвалі?

Рука руку мые...

29 жніўня ў 8.40 у першай праграме беларускага радыё чую выступленьне сп. Дашкевіча, якога прадставілі начальнікам аддзела Дзяржкамдруку, і гэты супрацоўнік «міністэрства праўды» на прыгожай беларускай мове вяшчае пра міжнародную габрайскую змову плямы сіяніцкіх колаў, агента Пазьняка. «Невыпадкова, — кажа дзяржаўнае радыё, — на месца Пазьняка прыйшоў Баршчэўскі: справа ў тым, што Баршчэўскі нядрэнна валодае іўрытам». Далей агітатар запэўніў аўдыторыю, што «нас усе палохаюць рускім фашызмам, а хто іх бачыў, рускіх фашыстаў? Няма рускіх фашыстаў». На заканчэньне перадачы, у 8.50, жанчынка сказала: «Я дзякую нашаму госьцю за цікавае выступленьне». Голас яе дрыжэў.

Нядаўняга палкоўніка расейскай ФСК Ерына на пачатку жніўня зрабілі намесьнікам міністра ўнутраных справаў Беларусі і генэралам; нядаўняга палкоўніка расейскай ФСК Юркіна зноў павысілі ў званьні і паставілі намесьнікам старшыні Савету Бясьпекі РБ.

Распальваньне нянавісьці — шлях да перамогі, абраны нашымі шэрымі палкоўнікамі-агітатарамі. На прэзыдэнцкіх выбарах яны распальвалі варожасьць да каталікоў і палякаў, яны распаўсюджвалі чуткі пра Кебіча, які нібыта вывез сям'ю у Ізраіль, і пра Шушкевіча, які нібыта вывез беларускае золата у Польшчу. На рэфэрэндуме 1995 году яны распальвалі нянавісьць да інтэлігентаў, што ядуць наша сала і мазюкаюць нікому непатрэбныя незразумелыя карціны, да беларускамоўных, якія ўсе пагалоўна — дзеці паліцаяў. На выбарах у парлямэнт яны распальвалі нянавісьць да «тоўстых банкіраў», багатых, якія ўсе, нібыта, спэкулянты. Цяпер — нянавісьць да Амэрыкі, да габраяў, да хахлоў...

Палкоўнікі Замяталін, Пасахаў хочуць прывучыць нас, што маралі, праўды, сумленьня няма. Яны карыстаюцца праверанымі рэцэптамі, якім навучаў палкоўнік Латыпаў у школе КГБ: валі на габраяў, палякаў, амэрыканцаў, інтэлігенцішак...

Няма на іх БНА БНСО.

Я чалавек апалітычны. Мне пляваць, хто там прыйдзе ўладзе, амаль пляваць, што там за эканамічная палітыка робіцца, але я не магу цярпець няпраўды, нянавісьці, прыніжэньня. Мне агідны фашызм, што наплывае і наплывае. Чалавек ніколі, ні ў якіх абставінах не павінен апусакацца да шавінізму.

УНА УНСО да шавінізму апускаецца. Але я цалкам зразумею, калі зьявіцца беларуская самаабарона ад дыктатуры расейскіх палкоўнікаў.

Андрэй Дынько

УНА-УНСО не апускаецца да шавінізму

Ня можа апусьціцца, каб і хацела. Так, ад нацыяналізму да шавінізму і фашызму — адзін крок. Але гэты крок ніколі ня будзе зроблены ні беларускімі, ні украінскімі нацыяналістамі, і вось чаму: у прысутнасьці Расеі, зь яе маніяй «называць усе расейскае славянскім, каб потым мець магчымасьць назваць усё славянскае расейскім», і беларускі, і украінскі і у лэўнай ступені польскі нацыяналізм — гэта проста напружаньне ўсіх сілаў, каб ня быць затаптаным шматлікім моцным расейскім народам; гэта напружаньне ўсіх сілаў дзеля таго, каб гэтая — наша зямля канчаткова не ператварылася ў сьметнік. Расейскі ж нацыяналізм — гэта фашызм — самаабарона звыш неабходнага. І джын з бутэлькі ўжо выпушчаны...

Што да мэтадаў УНА, якія выклікаюць у цябе такую саркастычную ўсьмешку... Вось ты, разумны і дасьведчаны, сьмяяўся ці плакаў, калі чытаў гэтую новую «канстытуцыю»? Ты ня ведаў, што рабіць. А УНСоўцы — ведаюць. Таму ў іх, ва Украіне — новая Канстытуцыя, а у нас — сьмех праз сьлёзы. Таму Украіна будзе рабіцца ўсё больш заможнай, а што будзе ў нас?

Дабро павінна быць з кулакамі. Нават не дзеля таго, каб перамагчы зло — каб яго ўраўнаважыць. А пасьля гэтага можна перамагчы і словам.

А то што? Сямен Шарэцкі гаворыць — і як з гуся вада; Станіслаў Багданкевіч даводзіць — і як з качкі бруд; Аляксандар Фядута палымяна піша — нуль па фазе эфэкту. Зноў жа пра лом згадваюць... А дзе ён, той другі лом?

А хлопцы-украінцы малайцы, як па мне. Фізычная падрыхтоўка на ўзроўні, што й казаць. Трымаюцца так, што заглядзісься — дарма што схуднелыя ды бледныя. Ды твары у іх прыгожыя — сьветлыя, дай Бог ім здароўя ды добрых жанок.

Так што гартуй мускулы, Андрэю. А жыцьце нуднае ды бязглуздае, нібы прамова памянёнага табой Замяталіна.

Натальля Бабіна

PROMENADE

Туга па горадзе NN

Я ня ведаю, чаму мяне цягне туды так раптам. Расейскай мовы мне й тут хапае. Ня кажучы пра іхнюю папсу ў нашым эфіры. Не гаворачы пра ўсялякія інтэграцыі з інаўгурацыямі. Але ўтрымаць сябе ўжо не магу. І хай аўто мае тройчы ўкраінскае. Хай дарогі наперадзе сугуба расейскія. Ды на адвечнае расейскае пытаньне: куды ж дакоціцца маё кола, — я ведаю цьвёрды адказ. Да Ніжняга Ноўгараду.

Трохі было падзабыўся я расейскія маштабы пачалі нагадваць пра сябе ледзь не на праезьдзе мяжы. Усё радзей трапляліся вёскі, ды й тыя выглядалі ня надта жыва. Асабліва вылучаліся дамы барачнага кшталту (гэта ў вёсцы!) дзе-нідзе на тле «барочных» сядзібаў «новых расейцаў». Усё далей адсоўваўся даляглял, саступаючы законнае месца расейскім прасторам. Усё больш адчувальнаю станавілася туга, незразумелая мне самому.

Да Масквы пад'яжджаў ужо ў цемры. Дакладней, да Масквы заставалася яшчэ кілямэтраў сто. Таму ўласна цемры на шашы не было. А было адчуваньне хуткага набліжэньня да супэрмэгаполісу, што мацнела з праездам яшчэ аднаго міліцэйскага паста, яшчэ аднаго асьветленага скрыжаваньня, яшчэ аднога горада-спадарожніка. І так на працягу цэлай сотні, адлегласьці, што дома здавалася мне даволі значнаю. Зрэшты, чым павінен быць уезд у сталіцу, як не цырымоніяй.

Пад такі даречы крык Высоцкага з дынамікаў я ўляцеў (ці ўліп) у бясконцы й шумны паток стоп-агнёў, рэклямных экранаў ды асьветленых вітрынаў. Зь першага свайго скрыжаваньня гэты горад цалкам апраўдваў тыя мілі чаканьня чагосьці незвычайнага. Імкнучыся ехаць як мага павальней, я ўсё адно не пасьпяваў разглядаць мадэрновыя плады знакамітага маскоўскага будаўнічага буму ды адзначаць зьмены ў горадзе, які, як сам і чыў, знаў калісьці ад і да.

Я толькі чуў пра неабходнасьць ці наадварот будаўніцтва Храма Христа Спасителя. А пабачыўшы, нават не згадаў тыя гакія доўгія ды аргумэнтаваныя дыскусіі. З-за рога змрочнага «Дома на набережной» выплыў, каб асьляпіць, зьбянтэжыць, агроміністы да немагчымага і велаты да вар'яцтва купал. Чатыры гіганцкія краны на баках ня толькі не дадавалі збудаваньню незавершанасьці, а яшчэ больш падкрэсьлівалі ягоныя фантастычныя памеры... Якая гэта радасьць — вырвацца з маскоўскага транспартнага пекла на Уладзімірскі тракт. Які са сваімі адвечнымі калдобамі ды «пізанскімі» званіцамі адразу падаецца раем. А маладая, самай пякучай прыгажосьці цыганка адной усьмешкай ператворыць ЗАЗ у Mercedes. А шыльдачка «До Челябинска» у руках аўтастопшчыкаў прымусіць рэшту адлегласьці зрабіцца проста сьмешнаю. Я цматкроць уяўляў свой трыюмфальны ўезд у гэты горад на сваім «сымбалі посьпеху». Але што сапраўдным тым сымбалем будзе гэты горад — ніякім чынам ні сьніў, ні бачыў. Шырокая рака сьвежага асфальту зьмяніла ўжо абрыдлую двухпалку. Пераліўшыся ў гарадзкую вуліцу, яна не прыдбала ніводнай ямiны. І чаго я зусім ужо не чакаў, вуліца была чыстаю. Нават на тратуарах кудысьці падзелася сьмецьце. Так, горад стаў адкрыты для іншаземцаў. Сталічныя амбіцыі граюць на ўсю моц. Зноў жа — Кірмаш. Але хто ж гэта прыбраў з вуліцаў роднага раёну зь мілагучнаю назваю Канавино стогадовы бруд? Пасьля гэтага адкрыцьця таму яшчэ мне тут зьдзіўляцца?

Навошта я сюды прыехаў? Што так цягнула мяне сюды? Чаго я хацеў тут знайсьці? Настальгі?

Я набыў пачак «Беламору», урачыста выйшаў у свой горад у пошуках гэтага салодкага пачуцьця. Я так марыў прысесьці на тым услончыку, дзе не сядзеў дзесяць гадоў і, насьвістваючы нейкую падзабытую візбараўскую песьню, завалачыся папіросным дымам успамінаў. Уявіце, што не было ў мяне дзесяці гадоў. А разам зь імі й Беларусі, і Вільні, і яшчэ шмат чаго не было. Бывцам гэта дадало б мне чаго-небудзь эліксырна-прадуктыўнага.

Паблукаўшы паўдня ды выпаліўшы паўпачака, я так нічога цікавага й не адчуў. Хіба толькі лёткае замуленьне ад расстраляных папіросаў. Заставалася толькі пасумаваць аб дарэмна пакінутай бацькаўшчыне. Ці пайсьці п перайменаваных вуліцах не майго гораду ў пошуках адкрыцьцяў.

Далёка ісьці не давялося. Паўсюль, дзе толькі магчыма затрымацца воку, красаваліся ўдала зробленыя каляровыя фотакраявіды Ніжняга з тэкстамі-лёзунгамі. Надпісы «Это наш с тобою город», «Твой город — твоя жизнь» ці проста унцыяльным шрыфтам «Нижний Новгород» стваралі гораду своеасаблівы культ і трохі растлумачылі мне паходжаньне ягонай такой нязвыклай чысьціні. (Вось чаго, даречы, не хапае чысьціні нашае мовы, дык гэта культу.) Чысьціня была нават вакол будаўнічых пляцовак і рэстаўраваных, зацягнутых нейкаю камуфляжнаю тканінаю фасадаў. Над кожным будынкам, што раней слаба нагадваў царкву, уздымаліся купалы. Кожнае вольнае раней месца забудоўвалася і кафэшкаю, ці прыватным палацам. Таксама ўзрадавала невялікая, адносна памераў горада, колькасьць аўтамабіляў. Квасны патрыятызм нарэшце саступіў месца патрыятызму аўтамабільнаму. 5-ці дзьверныя «Нивы» з посьпехам канкуруюць тут са сваімі аналягамі. Чаго ня скажаш пра радыётэхніку. Я не сустрэў ніводнай кватэры, дзе ня быў бы заменены стары «Рекорд» з «Чайкаю» на Sharp з Panasonic'ам, з прычыны таннасьці апошніх. Кодak таксама ўвайшоў амаль у кожны расейскі дом, зрабіўшы расейскае жыцьцё больш маляўнічым. Што прыемна адзначыць яшчэ, дык гэта той факт, што ў разьліках як гатоўкай так і «в уме» расейцы ўжо не карыстаюцца «ўмоўнымі адзінкамі». Толькі рублямі. Хоць і апошнімі справы складаюцца у кожнага па-рознаму. Што тут кіруе самы малады й дэмакратычны губэрнатар, я чуў. І што Масква тут ніколі не была ўказам, таксама ведаў. Але што да гэтага, ці ад гэтага простаму расейскаму чалавеку? Напрыклад, маім сваякам. Людзям, якія ў разнастайнасьці лёсаў, ўзросту і «сацыяльнай выбаркі» не саступаюць пэрсанажам «Русского проекта».

Братан Вованка, дабрэйшай душы чалавек, атрымаўшы ў Чачэнскай бойцы траўму галавы, пакінуў службу машыніста й працуе сьлесарам у дэпо. Месяцовага заробку ў мільён яму хапае каб ня быць у крыўдзе на жыцьцё й карміць сям'ю. Сястрычку Машаньку, дзяўчыну са зьнешнасьцю Чырвонага Каптурка, хвалюе раздор з жаніхом. Жаніх цікавы ўжо тым, што, будучы сынам блатнога и багатага папы абраў завод, як першы доказ сваёй жыцьцяздольнасьці.

Дарэчы, тых блатных ці «новых» настолькі шмат тут разьвялося, што ледзь ня кожны мае ў сваяках, сябрах ці, прынамсі, суседзях па пад'езьдзе свайго бізнэсмэна ці бандыта. Што, зрэшты, і робіць іх героямі шматлікіх анэкдотаў. Безьліч якіх не распавядаў мой сямнаццацігадовы кузэн Алёша. Паўнаўладны прадстаўнік новага пакаленьня. У параўнаньні зь якім мае, дзесяцігадовай даўнасьці, сёньня выглядала б племем тубыльцаў. Складаньне кампутарных праграмаў, беглае чытаньне ангельскіх тэкстаў ды вольнае карыстаньне жывымі пладамі сэксуальнай рэвалюцыі, — справы для іх натуральныя, як само жыцьцё. Якое не пасьпела яшчэ нічым азмрочыцца. Адзінае, што нас лучыць, гэта, на маё зьдзіўленьне, песьні. Старыя турысцкія песьні Візбара й Кукіна, якія яны сьпяваюць у вандроўках за палярнае кола. Пра Чачэнію (а тым больш, пра Беларусь) ім думаць ня хочацца — іх прызыў яшчэ не надышоў. Пра Чачэнію я пачуў толькі ад майго шасьцігадовага пляменьніка Сашы, які праціўнікаў кампутарных гульняў называе чачэнамі. Але ягонага прызыву, дасьць бог, можа й ня будзе ўвогуле...

Шпацыруючы па Большой Покровской у пошуках хоць якой-небудзь прыстойнай друкаванай прадукцыі мясцовай вытворчасьці, я натрапіў на падручнік геаграфіі для старэйшых клясаў. Дзе знайшоў «нашу зялёную рэспубліку» ў разьдзеле «Зарубежная Европа». Які не зьбіраюцца ні адмяняць, ні перапісваць. І куды мяне цягне зноў, як і дзесяць гадоў таму...

Зьміцер Бартосік

Міжнародны камэнтар

Доўгая сьмерць камунізму

Але, мабыць, annpay [illegible] юнакоў у Паўночную Карэю, [illegible] — жменьку рысу ў дзень [illegible] будучь [illegible] назад, як Лі Харві Освальд [illegible] з Менску ў Амэрыку. А пакуль што [illegible] кроў за падманныя [illegible], за падманную справядлівасьць, ачмураныя легуценьнямі інтэлектуалаў, што ставяць [illegible] замкі [illegible] за жывы досьвед гісторыі. Гэтак Сартр, прыехаўшы у самы разгар брэжнеўшчыны у Літву, [illegible], як добра ім жывецца, як ім пашанцавала апынуцца ў складзе савецкай імпэрыі. У самаабсесаванай [illegible] частцы эўрапейскай [illegible] Цэнтральная Эўропа і Расея займалі месца [illegible] гэтак да канчатковага падзеньня жалезнае заслоны. Цяпер ужо стала нельга не заўважаць тых жахаў, якія спарадзіла савецкая сыстэма, і яго ўбоства, да якога яна давяла гаспадарку сваіх [illegible] краінаў. Але, развітаўшыся з ілюзіямі пра Савецкі Саюз, [illegible] частка французкай [illegible] [illegible] вынікаў [illegible] [illegible] прыпадаў, дзе жыць было б [illegible] проста, пры пачаснай [illegible] Чэ Гевары [illegible]-Чанга... Што й казаць, паміма [illegible] [illegible] Томаса Мора. Прычым [illegible] марксісты, што усё можа зьмяніць разумныя і справядлівыя [illegible], што [illegible] родных гусеяў. Вось чаму многія [illegible], хто абураны несправядлівасьцю [illegible] сьвету, з такой палкасьцю [illegible] свае спадзевы на мэксыканскага філёзафа, што ўзначаліў паўстаньне, пераважна [illegible] рух так званага «каманданта Маркаса».

Гэты дзіўны чалавек [illegible] былых кіраўнікоў народных паўстаньняў у Лацінскай Амэрыцы сваёй харызматычнасьцю, [illegible] тым, як яму пашанцуе. Парыскія і міланскія студэнты носяць [illegible] з выявамі каманданта Маркаса і Чэ Гевары. Але вынікі [illegible] не ўсім [illegible] зараз. [illegible] тым, што камандант Маркас ніколі не здымае з твару чорнае маскі. Дзякуючы [illegible] журналістаў, [illegible] мэксыканскай спэцслужбы [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]. Цяпер вядома, што новы Фарлонд [illegible] Маркас [illegible] факультэт філязофіі

[illegible] 1995 году [illegible]

када рэвалюцыйнага войска» [illegible] прозьвішчы правадыра мэксыканскай рэвалюцыі пачатку стагодзьдзя, раптоўна і ўраз захапілі некалькі гарадоў і мястэчкаў у штаце Чапас, самым глухім рэгіёне краіны. Чаго яны хочуць? Справядлівасьці і лепшага жыцьця. І дай ім Бог дзьвіжаць тое лепшае жыцьцё. Мой знаёмы студэнт юрыдычнага факультэту унівэрсытэту Мэхіка Кастар Альварэс сьцьвярджае: «Камандантэ Маркас не такі як Фідэль Кастра альбо Даніэль Артэга, ён разумее, што рэвалюцыя дае плён толькі тады, калі знойдзе новую, а цяпер можна казаць — ідэальную мадэль эканамічнага ладу; і яму зусім непатрэбная ўлада. Проста ён усьвядоміў, што цярплівай, доўгай мірнай барацьбой ні халеры не дабʼесься. Трэба прыціснуць тых, хто мае [illegible], а адлае замала. І мы радыя, што вызваленьне сьвету ад націску амэрыканскай культуры, комікса, вай эстэтыкі і вымярэньня вечных каштоўнасьцяў у даляравым эквіваленьце пачнецца з Мэксыкі»

У [illegible] мне [illegible] ўзяць [illegible] у міжнародным [illegible] праблемаў [illegible] (Італія). Калі адзін з італьянскіх прамоўцаў у сваім выступе пра Інтэрнэт [illegible] што нібыта нясе разбурэньне чалавечай самаасэнсаваньні і злучанасьці чалавека да пераўтваральнай дзейнасьці, удалу, што камандантэ Маркас здолеў [illegible] сусьветную грамадзкасьць на эканамічны форум (які ён склікаў у мэксыканскай сэльве) праз Інтэрнэт, бо сетка — [illegible] разбуральнік пенатараў, насьпі чалавека, што яшчэ й прыносіць даход міжнародным манаполіям, заходнеэўрапейская і амэрыканская частка аўдыторыі выбухнула бурнымі воплескамі, цэнтральнаэўрапейская частка сьціпла прамаўчала. Мы маем досыць досьведу, каб насьцярожана ставіцца да любых герояў, любых рэвалюцыяў, любых забурэньняў, якія ня ставяць сабе на мэце аднаўленьне адвечных традыцыяў, адвечных інстытутаў грамадзтва, умацаваньне парадку, сям'і, грамады, пашы, сумленьня у тых, хто шануе утопіі, да якіх трэба крочыць праз кроў, болып за права на «простае шчасьце людзкое». Мы маем досьвед марніу да мітычнага стану, калі «сцішацца битвы, суцішацца краіны і к мове супольнай прачасьвяць дарогу».

Адмова ад рэклямы таксама можа быць рэклямай. Перамога рэвалюцыі не вырашае падзелу на багатых і бедных, толькі багатымя робяцца тыя, хто меў сьветлую славу і прававу з ночы да ночы, а тыя, хто трымае са зброяй, хто пасьпеў [illegible] жалезныя мускулы. Розьніца паміж дыктатурай арыстакратыі [illegible] і «[illegible]» [illegible] невялікая, і тая, і другая несправядлівая, толькі большасьць звычайна ня мае рацыі.

А у [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] Данізль Міттэран, удава Франсуа Міттэрана. Яна справядліва заклікала [illegible] [illegible]

Андрэй Дынько

Амэрыка — зблізку

Клетка, якая мае больш праваў, чым чалавек

З богам на чатырох колах здарылася тое, што здараецца з усімі багамі: яны зьяўляюцца на сьвет, каб служыць людзям, рагавалі [illegible] [illegible] самоты, а пасьля, у выніку, прымушаюць людзей служыць сабе. Культ аўтамабіля, найсьвяцейшы пасад якога знаходзіцца у Злучаных Штатах, таксама зрабіў людзей сваімі рабамі.

Уявіце сабе райскую карціну у кожнага амэрыканца за маўленьне [illegible] стрэльбе. У Штатах [illegible] [illegible] аўтамабіль [illegible] арсенал зброі добра працуюць. Дзьве асноўныя галіны амэрыканскай народнай гаспадаркі. Кожна шостая [illegible], шостая. Шостую частку [illegible] амэрыканцы [illegible] аўтамабіль [illegible] [illegible] знаходзяцца на колах, [illegible] [illegible] дзе працоўнае месца [illegible] або [illegible] [illegible]

Менш [illegible] [illegible] праводзяць на колах, чым больш [illegible] ад другіх [illegible] [illegible] [illegible]

Машына, [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] Ламах [illegible] [illegible] жам [illegible] у дарожных [illegible] штогод гіне і церпіць больш амэрыканцаў, чым загінула у вьетнамскай вайне, а [illegible] [illegible] дакумент [illegible] [illegible]

Відаць, [illegible] [illegible] больш [illegible] [illegible] [illegible] зачэп [illegible], не зьдымець [illegible] рахунку, не атрымаеш даведкі, не падпішаш кантракту. [illegible] у ЗША замяняюць пашпарт. Аўтамабіль [illegible] [illegible]

Дзякуючы [illegible] [illegible] там, шахам у [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible], ЗША [illegible] [illegible] [illegible]

[illegible] клетам амэрыканская ваенная прамысловасьці.

Скажы мне, якую машыну маеш, і скажу табе, хто ты і чаго ты варты. Цывілізацыя, што гэтак безьмерна любіць аўтамабілі, панічна баіцца старасьці. Машына [illegible] прамень надзеі на вечную маладосьць — другое цела чалавека, якое можна замяніць. Надзвычайна [illegible] большая частка тэлевізійнай рэклямы, большая частка размоваў і большая частка [illegible] ў гарадах. Машына мае ўсё: тут тавар і рэстаран, дзе кормяць гамбургерамі і алеем, тут таблеткі з медыкаментамі, шпіталі, дзе праводзяць тэхагляд і печаць, спачывалі гаражы і могілкі. Машына [illegible] [illegible] для чалавека [illegible] [illegible], але ўрашце яна аказваецца клеткай, якая заўжды з табой. Працоўны [illegible] [illegible] [illegible], патрэбны, калі дзейнічае на [illegible] большае, [illegible] ўжо дзеіцца гадзінамі у [illegible] у Лос-Анджэлесе [illegible] [illegible] можна атрымаць, [illegible] [illegible] у [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] ў горадзе Рэна, штат Нэвада, заяжджэш пад вычбы з пластыкавых кветак, у адно вакенца зазірае [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] у вакенца, [illegible], «love donation», як той амэрыканец кажа. Аўтамабіль, [illegible], якое можна падзяваць, [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]

[illegible] [illegible] [illegible] зямля. Любую рэкламу цыгарэтаў перакрыжоўвае [illegible] [illegible] здароўя [illegible] дым утрымлівае чад. Але звычайная рэклама не згадвае, [illegible] больш чаду [illegible] выхадныя газы [illegible] [illegible]

Эдуарда Галеана

[illegible] Андрэя Дынько

БЕЛАРУСКІ ФОНД СОРАСА
ІНСТЫТУТ АДКРЫТАЕ ГРАМАДЗТВА
абвяшчаюць аб пачатку
конкурснай праграмы
ПАДТРЫМКА СТВАРЭНЬНЯ ДАКУМЭНТАЛЬНЫХ І ВІДЭАФІЛЬМАЎ,
прысьвечаных абароне правоў чалавека, грамадзянскім свабодам і сацыяльнай справядлівасьці
Больш падрабязную інфармацыю об умовах удзелу ў конкурсе можна атрымаць у Беларускім Фондзе Сораса па адрасу
220027 г. Менск, пр.Ф.Скарыны, 65, корпус 11а БДПА, пакой 102,
а таксама ў абласных аддзяленьнях Фонду
210026 г.Віцебск, вул. Замкавая, 4, пакой 215, Віцебскае аддзяленьне БФС
246652 г Гомель, вул Кірава, 32-а, Гомельскае аддзяленьне БФС
З пытаньнямі звяртайцеся праз тэлефоны ў Менску: (017) 232-70-64, 232-80-92, 232-77-13

Каляндар

Смак незалежнасьці

[illegible] [illegible] [illegible] вечар [illegible] на руках дзяўчыну. Хочацца абмінуць, але хлопец [illegible] сябе, [illegible] [illegible] усьмешкай просіць: «Сябра, патрымай дзяўчыну». Збянтэжана трымаеш, а той [illegible] «Я толькі [illegible]». Пасьля забірае дзяўчыну [illegible] [illegible] далей.

Прыблізна гэтак большасьць беларусаў сутыкнулася ў 1991 годзе з незалежнасьцю. Зьдзівіліся, з прыемнасьцю патрымалі, але далей рушылі, як звычайна, прывычнай хадой. А калі б хлопец аддаў дзяўчыну і уцёк, што з ёй рабіць? Несьці далей? Як доўга? А якая яна? У прыцемках не разбярэся. А раптам [illegible] хлопцы, скажуць, каб аддаваў. Ды й што за «штучка» — невядома. Трымацца прыемна, [illegible] далей? Бачыцца бы зразумела, але хай будзе, як было: дома падʼеў, паспаў, а раніцай на працу, а там [illegible] незвычайным [illegible] [illegible].

У верасьні мы маем шэраг гістарычных датаў, толькі дзьве з якіх можна лічыць удалымі ў справе ЗДАБЫЦЬЦЯ незалежнасьці. Гэта — перамога над маскоўцамі пад Воршай у 1514, перамога над шведамі пад Белым Каменем у 1604. А яшчэ іншыя падзеі. 8 верасьня 1380 войскі ВКЛ так і не дапамаглі Мамаю на Куліковым полі, затое у той жа дзень крыжакі аблажылі Полацк. У верасьні 1612 войскі ВКЛ безвынікова змагаліся з апалчэньнем князя Пажарскага пад Масквой. У верасьні 1633 войскі ВКЛ удала абкружылі маскоўцаў пад Смаленскам [illegible] [illegible] апынуўся у складзе суседняй дзяржавы. [illegible] верасьня 1771 «разгром войска М.Агінскага акупацыйнымі палкамі А.Суворава пад Сталовічамі». 7 верасьня 1812 беларусы зьнішчалі беларусаў [illegible] Барадзіно. 1 верасьня 1939 на Захадзе беларусы баранілі Польшчу, за гэта праз пару тыдняў беларусы з Усходу [illegible] [illegible] бліжэй да Ціхага акіяну, дзе [illegible] верасьня 1945 распачалася Маньчжурская апэрацыя, у якой сярод іншых беларусы праявілі доблесьць [illegible]...

Гэтым верасьнем беларусы мусяць перайсьці ад абароны да наступу. Гэта адбудзецца ня у прыцемках, ды й дзяўчына, якую прыгнуць, ужо вельмі добра вядомая. Яна прыгожая і здаровая, насіць на руках яе цяпер неабавязкова, гэта будзе лепшая, на сьвята. А цяпер ёй проста трэба прапягнуць руку. Магчыма, рука будзе зьбітая, але нікога дзяўчына не чакае яе

Сяргей Квяткоўскі

№ 23/96
2 — 8 верасня

Інфарматар НАША НІВА

Новае штотыднёвае выданне, якое ... 8 палосаў ... інфармацыі

ІІ ОТЫДНЕВЬ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ДАДАТАК ДА ГАЗЭТЫ НАША НІВА

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ BELARUSIAN PUBLIC RELATIONS ASSOCIATION

Пералік мытняў,

іх месцазнаходжаньне і колькасьць пунктаў мытнага афармленьня Рэспублікі Беларусь на 1 студзеня 1996 г.

N п/п	Назва	Месца разьмяшчэньня	Колькасьць пунктаў мытнага афармленьня
	[illegible]	Менск, вул. [illegible]	234
	Менская цэнтральная мытня	г. Менск, вул. [illegible], 12	1
	Мытня "Заходні Буг"	г. Берасьце, [illegible]	10
1	Пінская мытня	Пінск, вул. [illegible]	8
[illegible]	Мытня "Менск 2"	[illegible]	1
[illegible]	Менская [illegible]	Менск, пр. [illegible], 83	37
	[illegible]	Віцебск, пр. Маскоўскі, 120	16
[illegible]	Браслаўская мытня	г. Браслаў, вул. Ленінская, 86	3
[illegible]	Берасьцейская мытня	Берасьце, чыг. вакзал	19
10	Верхнядзьвінская мытня	Верхнядзьвінск, вул. Савецкая, 19	
11	Аршанская мытня	Ворша, вул. Міру, 11	7
12	Полацкая мытня	Наваполацак, вул. Маладзёжная	14
[illegible]	[illegible] мытня	[illegible], вул. [illegible]	8
[illegible]	Гомельская мытня	Гомель, вул. [illegible]	33
15	Мазырская мытня	Мазыр, вул. [illegible], 64	12
16	Гарадзенская мытня	Горадня, чыг. вакзал	26
17	Воранаўская мытня	г.п. Воранава, вул. [illegible]	[illegible]
18	Астравецкая мытня	г.п. Астравец, вул. [illegible], 79	[illegible]
19	Ашмянская мытня	[illegible]	[illegible]
20	Магілёўская мытня	Магілёў, вул. Першамайская, [illegible]	13
[illegible]	Крычаўская мытня	Крычаў, пр. Камсамольскі, 101	10

ЭЎРЫКА!

альбо якім чынам яшчэ можна змагацца зь бяспраўем

У Вас [illegible] ... [illegible]

Калі ... [illegible]

Тавараведчая экспэртыза

Экспэртызу найчасьцей выкарыстоўваюць у сувязі з вырашэньнем маёмасных спраў. [illegible] (судова-тавараведчая) экспэртыза.

Аб'ектам яе дасьледаваньня можа быць неабмежаваная колькасьць тавараў. Зь ёю мы сутыкаемся ў штодзённым жыцьці: практычна ўсе харчовыя тавары, у тым ліку садавіна і гародніна, сыравіна, напоі, а таксама большасьць нехарчовых тавараў. Гэтыя тавары, дасьледаваньне якіх звычайна ажыцьцяўляецца у межах іншых відаў экспэртызы. Так, антыкварыят і творы мастацтва вывучаюцца мастацтвазнаўчай экспэртызай, нерухомасьць (катэджы, лецішчы, гаражы і г. д.)

[illegible] экспэртызы.

Экспэртыза звычайна вырашае наступныя задачы:

- вызначэньне якасьці тавару;
- вызначэньне [illegible];
- [illegible];
- адпаведнасьць [illegible];
- адпаведнасьць тавару [illegible] стандартным і іншым абавязковым таварным нормам;
- адпаведнасьць умоваў захаваньня і транспартаваньня тавараў [illegible];
- вызначэньне [illegible];
- вызначэньне факту прыналежнасьці частак і дэталяў да аднаго прадмету (камплекту);
- [illegible];
- вызначэньне роду [illegible];
- вызначэньне прычынаў зьмяненьня спажывецкіх уласьцівасьцяў і вонкавага выгляду тавару, выяўленьне дэфэктаў.

На экспэртызу [illegible] ... [illegible] характарыстыкі тавару.

Але, апроч самога тавару, экспэрту могуць спатрэбіцца дакумэнты, зьвязаныя зь яго куплёй і далейшай эксплюатацыяй: дамовы, чэкі, гарантыйныя талоны, кнігі, інструкцыі эксплюатацыі

і г. д. Пажадана, каб Вы захавалі ... [illegible]

... [illegible]

ДАПАМОЖАМ ПА[illegible]

БЛЯНКІ, [illegible]
ВІЗЫТОЎКІ, [illegible]
РЭКЛЯМОВЫЯ ДЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ УЛЁТКІ

Ужо — 1.000 экзэмпляраў за 10 хвілінаў. Танна — од 98 рублёў за копію. На паперы якое заўгодна ... і на кардоне
Тэл. 39-78-49

І КОШТНЫЯ ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

18.40 [illegible]
19.25 [illegible]
20.40 [illegible]
20.55 [illegible]
21.10 [illegible]
21.50 [illegible]
22.05 [illegible]
22.55 [illegible]

IV КАНАЛ, НТВ

6.00 [illegible]
6.20 [illegible]
6.45 [illegible]
7.35 М/ф. [illegible]
9.35 [illegible]
10.20 М/ф. [illegible]
11.45 [illegible]
12.35 [illegible]
15.05 [illegible]
15.15 [illegible]
15.45 [illegible]
15.05 [illegible]
16.25 [illegible]
17.00 [illegible]
17.30 [illegible]
18.00, 21.00 Сёння.
18.30 [illegible]
19.00 [illegible]
20.00 [illegible]
20.45 [illegible]
21.35 М/ф. [illegible]
23.20 [illegible]
0.05 [illegible]

НЯДЗЕЛЯ, 8

БТ

8.00 [illegible]
8.40 [illegible]
9.15 [illegible]
9.40 [illegible] MTV.
10.10 [illegible]
10.40 [illegible]
11.00 [illegible]
11.30 [illegible]
11.50 [illegible]
13.10 Студыя "Вавёл".
13.25 [illegible]
14.20 [illegible]
14.55 [illegible]
15.50 [illegible]
16.20 [illegible] С. 3.
16.50 [illegible]
17.10 [illegible]
17.40 [illegible]
18.10 [illegible]
19.40 Калыханка.
20.00 [illegible]
20.50 [illegible]
20.55 [illegible]
21.10 [illegible]

ОРТ

7.00 [illegible]
7.10 [illegible] Мультфільм.
7.45 [illegible] С. 2.
9.00 [illegible]
9.15 [illegible]
9.30 [illegible]
10.15 [illegible]
11.00 [illegible]
11.30 [illegible]
12.00 [illegible]
12.35 [illegible]
13.25 [illegible]
14.00 Навіны.
14.20 [illegible]
15.05 [illegible]
15.50 [illegible]
16.05 [illegible]
16.50 [illegible]
17.15 [illegible]
18.05 [illegible]
19.00 [illegible]
19.40 М/ф. [illegible]
21.35 [illegible]
21.50 [illegible]
22.20 [illegible]
22.30 [illegible]

КАНАЛ "РАСЕЯ"

6.00 [illegible]
8.00 [illegible]
8.30 [illegible]
8.50 [illegible]
9.05 [illegible]
9.30 [illegible]
10.00 [illegible]
10.15 [illegible]
10.55 [illegible]
11.00 [illegible]
11.25 [illegible]
11.35 [illegible]
12.00 [illegible]
12.25 [illegible]
13.00, 23.10 Весці.
13.20 [illegible]
14.15 [illegible]
14.30 [illegible]
15.00 [illegible]
15.30 М/ф. [illegible]
16.10 [illegible]
16.25 [illegible]
17.00 [illegible]
18.00 [illegible]
19.00 [illegible]
19.55 [illegible]
20.00 [illegible]
21.30 [illegible]
21.45 [illegible]
22.40 [illegible]
23.20 [illegible]

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

9.10 [illegible]
9.40 [illegible]
9.55, 11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 20.55 Інфарм. ТБ.
10.10 [illegible]
10.35 [illegible]
11.10 [illegible]
11.30 [illegible]
11.40 [illegible]
12.10 [illegible]
13.25 [illegible]
13.35 [illegible]
14.10 [illegible]
15.10 [illegible]
16.10 [illegible]
16.35 [illegible]
16.50 [illegible]
17.35 [illegible]
18.40 [illegible]
19.25 [illegible]
19.45 [illegible]
21.10 [illegible]
21.55 [illegible]
22.25 [illegible]

IV КАНАЛ, НТВ

6.00 [illegible]
6.25 [illegible]
7.15 [illegible]
8.40 [illegible]
9.25 [illegible]
10.50 [illegible]
12.25 [illegible]
13.00 [illegible]
14.25 [illegible]
14.55 [illegible]
17.00 [illegible]
17.30 [illegible]
18.00 Сёння.
18.30 [illegible]
19.10 [illegible]
20.00 [illegible]
21.10 [illegible] М/ф.
22.55 [illegible]
23.45 [illegible]

2.09 – 8.09

КІНО. МЕНСК

АЎРОРА *(Прытыцкага, 23, тэл 533-360, 533-361)* – Гудзонскі ястраб 2-8 – 16.30, Маньяк-карат 2-8 – 18.30, 20.30; Для дзяцей: Ералаш (зборнік кінаэкспромтаў) 2-4 – 14.30, Пэдзі 5-8 – 14.30

ВІЛЬНЯ *(Калінаўскага, 55, тэл 655-262)* – Папарот лесу 2-7 – 15.00, 21.00, 8 – 15.00 (льготныя); Сьвята каханьня 2-8 – 16.50, 19.50; Зьнішчэ двух месяцаў 2 – 18.10; Інфармацыйна-забаўляльная праграма "Ухмешка" 3, 7-8 – 21.00; Танцавальны вечар "Для тых каму за 30" 6 – 20.30; Альтэрнатыўная дыскатэка 5 – 21.00; Кіна-дыска-шоў для падлеткаў 8 – 15.00.

ДРУЖБА *(Ташкенцкая, 4, тэл 408-013, 408-254)* – Дух помсты 2-3, 7-8 – 17.00; Пісьменнікі жарсьці 2-3, 7-8 – 18.40, 20.30; Інфармацыйна-забаўляльная праграма 4-5, 8 – з 20.30 да 23.30; Начная інфармацыйна-забаўляльная праграма 6-7 – з 22.00 да 5.00. Працуюць бар, більярд, гульнявыя апараты, абмен валюты.

ЗЬМЕНА *(Шаўгабродзкая, 4, тэл 353-905)* – Да Дня беларускай пісьменнасьці і друку, 8; Францыск Скарына (фільм знятага на кінастудыі "Беларусьфільм", рэжысёр Б. Сцяпанаў, аўтар сцэнару М. Лаўковіч, у галоўных ролях Алег Раманаў, Яўгенія [illegible], Мікалай Грыцэнка) 2 – 9.00, 12.30, 14.00, 3 – 12.30, 14.00, 16.00; Вяртаньне ваўчыцы 3 – 20.00, 2, 4-8 – 16.00, 20.00; [illegible] бываюць нявогныя 2, 4 – 18.00; 3, 5-8 – 14.00, 18.00; Для дзяцей: Сяброў знойдзеш заўседы (мульт.) 4, 6 – 10.00, 7-8 – 12.00

КАМСАМОЛЕЦ *(Жылуновіча, 33, тэл 454-194)* – Блакітны гром 2-8 – 12.00, 15.00, 19.00; Памерці за... 2-8 – 16.20, 20.30; Быць каханай 2-8 – 17.00, 20.40; Залатая калекцыя айчыннага кіно: [illegible] фільму Доўгае расстаньне (2 серыі) 2-8 – 14.00, 18.00; Для дзяцей: Грамадзяне сусьвету 2-4 – 10.30; Цікавае лета (мульт.) 5, 5-8 – 11.00

КАСТРЫЧНІК *(пр. Ф. Скарыны, 73, тэл 329-327, 329-429)* – Бацькоўская кроў 2-8 – 14.00, 17.20, 21.00; Эйс Вэнтура 2-8 – 15.30, 19.00; Мікс-шоў (тэл 232-00-38) 2-8 – 22.00.

КІЕЎ *(бульвар Шаўчэнкі, 13, тэл 373-270)* – Няма куды болей бегчы 3-6, 8 – 15.00, 7 – 15.00 (льготны); Спакуса 3-8 – 17.00, 18.30, 20.00; Відэапаказ 2-8 – 10.00, 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00; Для дзяцей: Чабурашка ідзе ў школу (мульт.) 3 – 13.30; Вораг мой 6 – 13.30

МАСКВА *(пр. Машэрава, 3, тэл 231-488, 231-533)* – Патруль часу 2-7 – 17.00, 19.10; 8 – 14.30 (льготныя), 17.20, 19.10; Смажаныя зялёныя памідоры 2-8 – 21.00; Для дзяцей: Дыск і к. "Ямгена" 8 – 12.00

МІР *(Калінава, 4а, тэл 533-77[illegible])* – На залатым ганку сядзелі [illegible] 2-8 – 12.00; Страсная 2-8 – 13.00, 17.00, 21.00; Гуны [illegible] 8 – 16.00, 18.00, 20.00; Шукай, дзе горача 2-8 – 15.00, 19.00

ПАРТЫЗАН *(Партызанскі, 18, тэл 663-526)* – Крывавая помста 2-4, 6-8 – 16.20, 19.30, 5 – 16.20 (льготныя), 19.40; Спакушэньне 2-8 – 18.10, 21.10

ПЕРАМОГА *(Інтэрнацыянальная, 20, тэл 237-245)* – Цыганскія вочы 2-8 – 15.00, 17.00, 19.00; Інфармацыйна-забаўляльная праграма 4-8 – 21.00; Дэнс-шоў 6-7 – з 24.00 да 6.00

ПІЯНЭР *(Энгельса, 20, тэл 278-945)* – Адзін дома 2-5 – 13.30, 17.10, 6-8 – 13.50, 19.20; Для дзяцей: Кацешка-пясочная 2-3 – 10.30; Белае сонца пустыні 2-3 – 12.00; Фантазёры 4-5 – 10.30; Піраты XX стагодзьдзя 4-5 – 12.00; Кот вернецца ў казку (мульт.), 6-8 – 10.30; Сакрэтны ўказ імпэратара 6-8 – 12.00

РАДЗІМА *(Ільі Чайкіна, 16, тэл 426-779)* – Вучыца 2 – 15.00 (льготны), 18.40, 4-8 – 15.00, 18.40; Жандар і жандарметы 2, 4-8 – 17.00, 20.20; Музычна-забаўляльная відэапраграма 4-5 – з 18.00 да 22.00; Музычна-забаўляльная праграма 6-8 – з 10.00 да 24.00; Відэазала: Маці, я жывы (для дзяцей) 4-8 – 16.00; Удар малпы 4-8 – 18.00; Дз[illegible]ман-2 4-8 – 18.00; У кінатэатры працуе відэабар. Для дзяцей: Ну, пачакай! (N 1-7) 4 – 10.30, 7-8 – 13.30

САЛЮТ *(пр. Ракасоўскага, 150а, тэл 417-[illegible])* – Неперамож[illegible] 2-8 – [illegible]; [illegible] 2-8 – 17.40, 19.30, 21; Начны танцавальны рух 6 – 21.00 да 6.00

СУЧАСЬНІК *(Харкаўская, 40а, тэл 575-[illegible])* – [illegible] жарсьці 2, 5, 8 – 16.30, 18.00, 19.30, 21.30, 4, 6-7 – 16.30, 18.00; Інфармацыйна-забаўляльная праграма "Аранжык" 4, 6-7 – з 23.00 да 23.00; Для дзяцей: Як бабуля вакзала [illegible] бабак 7 – 14.30; Страшыдла Вакна Гарыцына 8 – 14.30

УДАРНІК *(Жукоўскага, 150, тэл 259-630)* – Вар'ятка 2-8 – 15.30; Палацыянт і дзяўчына 2-8 – 17.10; Адзін момант 2-8 – 18.50; Для дзяцей: Школьны падарунак 4 – 14.00; Пунсовая кветачка (мульт.) 7-8 – 14.00

СЬЦЯГ *(Вялікамогская, [illegible], тэл 211-009)* – Зрэшку яны вяртаюцца 2-3, 6 – 16.20, 7-8 – 12.20, 16.20; Найвялікшы ў Нью-Ёрку 2-3, 6-8 – 18.00; Зона сьмерці 2-3, 6 – 19.30; 7-8 – 14.00, 19.30; Для дзяцей: Белыя ваўкі 7 – 10.40; Чынгачгук – Вялікі Змей 8 – 10.50

ЭЛЕКТРОН *(Казінца, 117, тэл 789-563)* – Уварваньне ў [illegible] 2-8 – 14.10, 19.20; Дзікае каханьне 2-8 – 15.50, 21.00; Гарачыя галовы 1 2-8 – 12.40, 17.50; Для дзяцей: Іван Царэвіч і Шэры воўк (мульт.) 7-8 – 11.30

ВІДЭАСАЛЁН: Шаша. Рэж. Мэгю Браун, у ролях Кіфэр Сазэрленд, Рыз Уітэрпун, Брук Шылдс. Трылер. ЗША. Для дарослых. Ванэса – цяжкі і пам самым часам няшчасны падлетак. Маці – прастытутка і наркаманка, айчым – наркаман і вырадак. [illegible] арышту бацькоў [illegible] уцякае з хаты [illegible] сваёй бабулі ў Лос-Анджэлес. Нейкі [illegible] Боб Вулвэрт прапануе падвезьці. Ва [illegible] Ванэса становіцца маньяка [illegible] 2-8 – 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00. Кошт квітка 2000 рублёў.

Найменш і найбольш надзейная тэхніка

Брытанская асацыяцыя спажыўцоў правяла цікавае дасьледаваньне, як часта псуюцца розныя бытавыя прыборы.

На аснове апытаньня чытачоў часопіса "Wchich?" быў складзены вось такі графік, на якім паказана працэнтная колькасьць машынаў кожнага тыпу, якія псуюцца ў першыя 12 месяцаў пасьля пачатку эксплюатацыі

З графіка добра відаць, што верагоднасьць паломкі ў некаторых відаў тэхнікі значна вышэйшая, чым у іншых.

Так, напрыклад, пральныя машыны належаць да найбольш ненадзейных. 24 працэнты пральных машынаў патрабавалі рамонту ўжо у першы год, што значыць у шэсьць разоў большую верагоднасьць іхнага псаваньня чым, напрыклад у мікрахвалевых печаў.

Працэнт сапсаваных прыстасаваньняў

Пральныя машыны з сушылкай	30
Пральныя машыны	24
Пасудамыйныя машыны	15
Відэамагнітофоны	11
Факсымільныя апараты	10
Каляровыя тэлевізары	8
Барабанныя сушылкі	8
Камкордэры	7
Пыласмокі	7
Аўтаадказьнікі	5
Лядоўні маразільні	5
Мікрахвалевыя печы	4

Анкета

Беларуская Асацыяцыя Public Relations праводзіла міні-дасьледаваньне сярод спажыўцоў Менску. Выбарка 550 чал. Паводле вынікаў анкетаваньня самыя актуальныя

прадукты харчаваньня	173 галасы	**дзіцячае харчаваньне**	6
зь іх **мясныя**	16	**аўдые-, відэатэхніка**	88
малочныя	15	**электрабытавая тэхніка**	83
лікёра-гарэлкавыя	14	**парфумэрыя і касмэтыка**	33
безалькагольныя напоі	4	**мэдычныя прэпараты і лекі**	31
садавіна і гародніна	17	**абутак мужчынскі і жаночы**	22
кандытарскія вырабы	12	**прадметы асабістай гігіены**	21
		тавары для дзяцей	14

Адрозныя рысы тэхнікі фірмы SONY.

Апошнім часам крамы поўняцца электроннай тэхнікай замежных фірмаў, прычым на дзьве трэціны гэта апаратура фірмы SONY

Пакупнікі набываюць яе зусім часам не задумваючыся, хто і дзе, уласна кажучы, яе зрабіў. Галоўны паказьнік – назва, вядомая на ўвесь сьвет. Менавіта гэты факт выклікае сур'ёзныя клопаты.

Асноўная праблема у тым, што "чаўнакі", а таксама шматлікія фірмы, спрабуючы зарабіць як мага болей і як мага хутчэй, налодзілі бесьперапынныя пастаўкі апаратуры фірмы SONY зь Сінгапуру и Дубая, якая каштуе там значна меней.

Аднак не ўлічваецца той факт, што тэхніка, зробленая адмыслова для гэтых рэгіенаў, сьвядома робіцца вытворцам таньнейшай за кошт адсутнасьці ў гэтых краінах строгіх патрабаваньняў да сэртыфікацыі і таму зусім не падыходзіць для нас з-за неадпаведнасьці эўрапейскім стандартам і патрабаваньням бясьпек.

Адрозьненьні апаратуры для краінаў СНД

Як адрозьніць апаратуру, прызначаную для краінаў СНД, ад той, якая прывозіцца "чаўнакамі"? Па-першае, да тавараў, адмыслова прывезеных у СНД і краіны усходне-эўрапейскага рэгіёну абавязкова прыкладаецца інструкцыя на расейскай мове, сэртыфікат бясьпекі гарантыйны талён тэрмінам на 1 год. Гарантыйны талён для Блізкага Ўсходу у Беларусі несапраўдны. Па-другое, у назьве мадэляў прызначаных для нашага спажыўца ёсьць літары

- аўдыетэхніка: EE, SJ;
- відэамагнітофоны, відэапле[e]ры: EE (напрыклад, відэамагнітафон SLV 486EE, відэаплэер SLV P31EE);
- тэлевізары: K, MK (напрыклад, тэлевізар KV-M1400K)

Прадстаўнікі фірмы SONY ў [illegible] раяць не набываць тэлевізары, назвы якіх заканчваецца на абрэвіятуры MT (напрыклад, KV-1485MT) і відэамагнітофоны ці відэаплэеры, у марцы якіх ёсьць літара X (напрыклад, SLV X55, SLV XR9). Аўдыетэхніку, якая мае ў назьве літары EE, адрозьнівае наяўнасьць сыстэмы аўтаматычнага выбару напружаньня сілкаваньня (65-84 МГц, 87,5-108 МГц), добры гук, прыём двух УКХ-дыяпазонаў (айчыннага і эўрапейскага). Акрамя таго, варта зьвярнуць увагу на сыстэмы сямейства Стэрэа Плюс, якія дазваляюць прымаць у стэрэа-рэжыме як верхні, так і ніжні дыяпазоны УКХ (FM). Унікальнасьць сыстэмы ў тым, што яна была адмыслова распрацавана для краінаў СНД і ня мае сусьветных аналягаў.

Навушнікі для плэераў

Ні ў якім разе не купляйце у камэрцыйных кіёсках навушнікі для плэераў Fontopia: яны ня маюць нічога агульнага з сапраўднымі навушнікамі SONY Fontopia – гонарам фірмы. Навушнікі Fontopia вельмі дарогія, бо гэта найвышэйшая клясы з шырокім дыяпазонам узнаўленьня пры такім маленькім памеры. Пры іхнай вытворчасьці выкарыстоўваюцца спэцыяльныя матэрыялы: мэмбрана з апфіравым напыленьнем, магнэсы з рэдказямельнымі металамі, пазалочаныя кантакты і г.д. Усё гэта дае высокую якасьць гуку і, вядома ж, падробкі проста ня ідуць ні ў якое параўнаньне. Кошт сапраўдных навушнікоў SONY Fontopia ад 50 да 300 даляраў ЗША

Гарантыйнае абслугоўваньне

Мы раім купляць прадукцыю SONY толькі ў афіцыйных дылераў і ў спэцыялізаваных крамах. Тады Вы будзеце застрахаваныя ад падробак. Толькі афіцыйныя дылеры даюць гарантыю на прададзены тавар, апошнія каталёгі прадукцыі фірмы. Кошт гарантыйнага абслугоўваньня ўваходзіць у кошт пакупкі. Усе афіцыйныя дылеры SONY маюць сэртыфікаты дылераў, якія звычайна вывешваюцца на бачным месцы у гандлёвых залах крамаў.

Цяпер у СНД існуе 15 сэрвіс-цэнтраў, якія ажыцьцяўляюць гарантыйны й пасьлягарантыйны рамонт апаратуры фірмы SONY. Іхныя адрасы пададзены на гарантыйных талёнах. Усе сэрвісныя цэнтры забясьпечваюцца запаснымі часткамі з Заходняй Эўропы і дэталямі, іхны пэрсанал прайшоў навучаньне у эўрапейскіх сэрвісных цэнтрах

Вы хочаце набыць якасны тэлевізар

Каб пазьбегнуць непрыемнасьцяў, купляйце складаную бытавую тэхніку ў буйных крамах. Не саромцеся адняць шмат часу ў супрацоўнікаў крамы і, калі Вам трэба пераканацца у добрай працы тэлевізара, на доўгі час пакіньце яго ўключаным.

Выбіраючы марку тэлевізара, зьвярніце ўвагу на тое, каб завод-вытворца тэлевізара знаходзіўся на тэрыторыі Вашай краіны, бо могуць узьнікнуць праблемы з гарантыйным рамонтам ці з настройкай тэлевізара

Зьвярніце ўвагу ў пашпарце на гарантыйны тэрмін. Калі ён не пазначаны, то лепш набыць іншую марку тэлевізара, вытворца якой гарантуе якасную працу. Калі ў пашпарце няма адрасоў гарантыйных майстэрняў, спытайце ў прадаўца адрэсу майстэрні ў Вашым горадзе

Штомп АТК у пашпарце павінен быць выразным. Дата выпрабу ставіцца звычайна не атрамантам, а пячаткай.

Установа-прадавец павінна паставіць свой штомп ці пячатку ў пашпарт, а таксама пазначыць дату продажу. З гэтага моманту пачынае налічвацца гарантыйны тэрмін.

Калі на штампе не пададзена юрыдычная адрэса прадаўца, абавязкова папрасіце яе пазначыць. Гэта Вам спатрэбіцца, калі тэлевізар будзе кепска працаваць і ўзьнікне неабходнасьць ягонай замены

Таварны чэк на ўсякую пакупку Вам абавязаны выдаць у адпаведнасьці з Законам "Аб абароне правоў спажыўцоў". Таму абавязкова папрасіце выпісаць чэк. Не хвалюйцеся, калі Вам адмовяць бо, калі ў пашпарт на выраб занесены зьвесткі, пра якія было сказана вышэй, Вы можаце лічыць дамову куплі-продажу сапраўднай.

ВІДЭА 19 – 25 чэрвеня 1996 г

ХІТ-ПАРАДЫ СЬВЕТУ:

а) Кіно. ЗША-Канада (лідары ўік-энду 9-11 чэрвеня 1996 г.).

1.	Джэк	$11,3 млн
2.	Час забіваць	$10,9 млн
3.	Уцёкі з Лёс-Анджэлесу	$9,3 млн
4.	Дзень Незалежнасьці	$8,0 млн
5	Матыльда	$5,0 млн
6.	Фэномэн	$4,0 млн
7.	Танцуговая рэакцыя	$3,3 млн
8.	Адвага пад агнём	$3,3 млн.
9.	Крануты прафэсар	$3,0 млн.
10.	Завадатар	$2,9 млн

б) Кіно: ЗША-Канада (Самыя касавыя фільмы 1996 году, што здолелі сабраць больш за $ 100 млн).

1.	Дзень Незалежнасьці	$241,8 млн.	(за 4 тыдні пракату!)
2	Сьмерч	$231,9 млн	(12)
3	Цацачная гісторыя	$191,5 млн	(36)
4.	Невыканальная місія	$174,6 млн.	(10)
5.	Скала	$126,5 млн.	(8)
6.	Птушыная клетка	$123,5 млн.	(19)*
7.	Крануты прафэсар	$109,9 млн	(5)
8	Эйс Вэнтура-2	$108,3 млн	(22)*
9.	Залатое вока	$105,9 млн	(26)*
10.	Джуманджы	$100,1 млн.	(20)*

* – (канчатковы вынік, пракат скончаны)

в) Міжнародны кінапракат (на пачатку чэрвеня лідары ў):

Аўстраліі:
1. Сьмерч
2 Невыканальная місія
3 Блізка да сэрца

Англіі:
1. Невыканальная місія
2. Лічачы цягнікі, што мінаюць
3. Скала

Нямеччыны:
1. Werner – Das Muss Kesseln
2. Скала
3 Echte Kerle

Гішпаніі:
1. Невыканальная місія
2 У пошуках прыгодаў
3 Дракула: мёртвы і задаволены

Бразыліі:
1. Сьмерч
2. Гарбун з Нотр-Даму
3. Невыканальная місія

Швэцыі:
1 Паляўнічыя
2. Скала
3. Кабэльшчык

Францыі:
1 Le Huitieme Jour
2. Лічачы цягнікі, што мінаюць
3. Прысяжная

Японіі:
1. Невыканальная місія
2 Сьмерч
3. Двубой

г) Самыя папулярныя фільмы відэапракату ў Менску (15 – 21 чэрвеня 1996 г.)

1 Дзень Незалежнасьці (баявік + камэдыя)
2 Сьпіна да сьпіны (баявік + камэдыя)
3 Выкуп (трылер)
4. Надта хуткі і маладыя (баявік)
5. Скала (баявік)
6. Прафэсія: сыстэмшчык (баявік)
7. Кабэльшчык (камэдыя)
8. Выйсьце ў чырвонае (трылер)
9. Каўкаскі палоньнік (драма)
10. Вядзьмарства (жахі)

[illegible] фірмы **"КАСТАЛОМ"**

[illegible] Stones, [illegible]

"ЛЯСНЫ ВАЯР"

[illegible]

"ШАША"

[illegible]

"НАРМАЛЬНАЕ ЖЫЦЬЦЁ"

[illegible]

[illegible] *Мікалай Кавалеўск*

САМАЕ СЬВЕЖАЕ ЗЬ ВІДЭАХІТОЎ

VIDEO+

Адрасы пунктаў пракату відэакасэтаў:
пр. Ракасоўскага, 11а; вул. Пляханава, 42; пр. Партызанскі, 117; вул. Багдановіча, 147; вул. В.Харужай, 18.

Без дыеты не абысьціся

Функцыянальная ежа, нутрыцэўтыкі, харчовыя ці дыетычныя дамешкі – у розных краінах гэтыя сродкі называюць па-рознаму. У нас часьцей ужываюць тэрмін "біялягічна актыўныя дамешкі да ежы" Яны ўяўляюць сабой канцэнтрат натуральных ці атрыманых хімічным шляхам рэчываў, якія ўжываецца разам зь ежай, замест ежы ці ўводзіцца ў склад прадуктау з мэтай узбагачэньня рацыёну. Мы пагаворым толькі пра тыя якія дапамагаюць пахудзець.

За мяжой яны вельмі папулярныя вольна прадаюцца ў крамах і аптэках, але ж мэханізм іхнага распаўсюджаньня стыхійны і няўстойлівы. Мы бачым што і ў нас у Беларусі гэтым займаюцца часта выпадковыя людзі

Фактычна, біялягічна актыўныя дамешкі нельга аднесьці ні да мэдыцыны, ні да харчовай прамысловасьці. Адсюль, верагодна, і кепская дасьведчанасьць людзей пра іхнае выкарыстаньне. Дамешкі па-рознаму ўплываюць на арганізм. Існуе тры тыпы дамешак рознай накіраванасьці.

Спэцыялізаваныя нізкакалярыйныя прадукты з канцэнтратамі біялягічна актыўных рэчываў, спальвальнікі тлушчу – біялягічна актыўныя дамешкі ліпатропнага дзеяньня і дамешкі анарэктычнага дзеяньня.

Так што выбар у ахвочых пахудзець ёсьць. Але сьпярша варта параіцца зь лекарам

Да прадуктаў першага тыпу – нізкакалярыйных, з канцэнтратамі натуральных рэчываў належаць "Biorapid" і "Liftitensil". Гэта дамешкі італьянскае фірмы Sant'Angelica, еины фірмовы знак жаночая постаць у палёце. Фірма дала на выпрабаваньні чатыры прадукты: "Biorapid" вадкі, "Biorapid" парашок, печыва "Biorapid" і "Liftitensil".

У дамешку "Biorapid" у мікрадозах ёсьць канцэнтраты гароднінавых і садавінавых сокаў, экстракты морскіх водарасьцяў, асобных траваў, кукурузны алей і аскарбінавая кісьліна. У печыве "Biorapid" акрамя таго ёсьць рыс, аўсяныя шматкі – дадатковыя крыніцы харчовых валокнаў. "Liftitensil" адрозьніваецца ад гэтых біялягічна актыўных дамешак і ўваходзіць у групу бялковых прадуктаў, прычым пераважае там бялок калаген.

Пацыентам аднае брытанскае клінік прызначаліся тры разгрузныя дні на тыдзень, на працягу якіх яны мусілі ўжываць толькі прызначаны ім дамешак. Аднак ня ўсе вытрымалі такія галодныя дні – за суткі зь "Biorapid" набіралася толькі 60-70 кКал. Тады лекары зрабілі такім чынам: два прыёмы ежы замянілі на "Biorapid", а ў абед давалі варанае нятлустае мяса ці рыбу з гароднінавым гарнірам, што складала на дзень 500-700 кКал. Такі спосаб, дарэчы прапануецца і ў анатацыі.

Выпрабаваньне доўжылася тры тыдні. Былі арганізаваныя дзьве групы: досьведная і група параўнаньня. У абедзьвюх групах былі пацыенты прыблізна аднаго ўзросту, з аднолькавай паталёгіяй, мелі аднолькавую дыету. Толькі адным у курс лекаваньня ўключалі дамешкі, а другім – не. Такім чынам клініка можа атрымаць максымальна слушныя вынікі эфэктыўнасьці выпрабавальных сродкаў.

За тры тыдні тыя, хто не атрымліваў "Biorapid" і тыя, хто сумяшчаў яго прыём з абедам у разгрузныя дні не нашмат адрозьніваліся ў вазе: першыя страцілі ў сярэднім 4,5 кг, а другія – 5,7 кг. У тых жа, хто у дзень разгрузкі прымаў толькі "Biorapid", страты вагі склалі ад 8 да 17 кг. Тыя, хто прымаў "Liftitensil", страцілі ў сярэднім 5,4 кг



Прааналізаваўшы антрапамэтрычныя паказьнікі пацыентаў, што прымалі "Biorapid" і асабліва "Liftitensil", які, як кажа рэкляма, спрыяе зьнікненьню падвойных падбародзьдзяў, тлушчавых адкладаў на целе, руках і нагах назіральнікі не заўважылі, каб эфэкт быў большы ад звычайнага

Дасьледаваліся адмысловцамі й арганалептычныя ўласьцівасьці дамешак. "Biorapid"-печыва пацыенты елі з задавальненьнем. Яно смачнае і за кошт вялікай колькасьці харчовых валокнаў дае адчуваньне сытасьці. Вадкі "Biorapid" і "Biorapid"-парашок многіх не задавальнялі з гледзішча смакавых якасьцяў

Была адзначана і розная адчувальнасьць да гэтых дамешак. У некаторых пацыентаў узьнікала пачуцьцё дыскамфорту ў вобласьці страўніка. У пацыентаў, якія прымалі "Liftitensil", непрыемных адчуваньняў не адзначана.

"Спальвальнікі" тлушчау самая рэклямаваная на цяперашні момант сэрыя дамешак. Вытворца іх – Спартовыя Лябараторыі ЗША (USA Spotrs Labs). На выпрабаваньне брытанскай клініцы былі пададзены "Fat Burner" з элькарнітынам "Fat Burner" з брамэляйнам і камбінаваны "Gutting Edge". Рэкляма й прадстаўнікі пераконваюць, што гэтыя дамешкі нішчаць тлушч, дый сама іхная назва – спальвальнікі – крыху страшыць. Насамрэч нічога кепскага ў "спальвальніках" тлушчу няма. Кампанэнты іхныя накіраваны на падтрыманьне абменных працэсаў. "Fat Burner" з элькарнітынам і брамэляйнам падобныя паводле складу. Элькарнітын – амінакісьліна ліпатропнага дзеяньня (яна ўзьдзейнічае непасрэдна на працэс мабілізацыі тлушчу). Брамэляйн – выцяжка з ананаса, якая ўяўляе сабой комплекс фэрмэнтау. "Gutten Edge" адрозьніваецца тым, што ў яго ўключаны комплекс траваў найперш бруля прочнага дзеяньня (плады ядлоўца талакнянкі й г. д.).

Страты вагі ў пацыентау пасьля курсу лекаваньня розныя – ад 3 да 10 кг на "Fat Burner" і ад 2,8 да 14 кг на "Gutting Edge". Адрозьненьні гэтыя, верагодна, былі зьвязаныя з рознай ступеньню фізычнай актыўнасьці. Дарэчы, у парадах вытворцы пададзены чатыры ўмовы, якія неабходна выконваць пры ўжываньні гэтых дамешак не пераядаць, не галадаць, не ўжываць сьпіртнога, павялічыць фізычныя нагрузкі

У выніку аналізу было заўважана добрае ўзьдзеяньне гэтых дамешак на арганізм: у прыватнасьці, янь зьніжаюць колькасьць халестэрыну у крыві.

Дамешкі трэцяе групы "Negry Line", "Negry Life", "Negry Form" маюць анарэктычнае дзеяньне. Вырабляе іх француская фірма Actidiet.

У якасьці асноўных актыўных складнікаў гэтых дамешак выкарыстоўваюцца клубні расьліны канжака й гуаравы каўчук. Поліцукрыны, якія ўваходзяць у склад канжака, у водным асяродзьдзі паглынаюць аб ём вады, які перавышае ягоны ўласны ў 100-135 разоў. Трапіўшы у страўнік, канжак купуюе пачуцьцё голаду, эфэкт набраканьня дае адчуваньне сытасьці.

У пацыентаў, якія ужывалі прэпарат, а яны прымалі па дзьве капсулы на дзень за 30-40 хвілінаў да ежы і абавязкова запівалі шклянкай вады – эфэкт падаўленьня пачуцьця голаду быў заўважаны ў 75 % выпадкаў.

Параўнальны аналіз вагі у кантрольнай групе і ў тых, хто атрымлівае дамешкі, паказаў, што вынікі былі лепшыя у апошніх Адчуваньне псыхалягічнай утульнасьці; адсутнасьць голаду прыводзіць да таго, што хворыя з большай строгасьцю прытрымліваюцца дыеты

Праграма збалянсаванага вузнага (клеткавага) харчаваньня **Гербалайф** накіравана перадусім на аздараўленьне ўсяго арганізму як цэлага праз забесьпячэньне на ўзроўні кожнае вузы: 1) глыбокай ачысткі ад шлякаў, таксынаў назапашаных за жыцьце, 2) абмежаваньне засваеньня шкодных рэчываў, якія ўвесь час трапляюць у нас з харчам; 3) павышэньне ўстойлівасьці да ўзьдзеяньня адмоўных чыньнікаў асяродзьдзя; 4) паўнавартаснае харчаваньне – забесьпячэньне ўсім жыцьцёва неабходным для правільнай дзейнасьці, чаго звычайна нестае з прычыны няправільнага і незбалянсаванага харчаваньня, – і нічога лішняга, непатрэбнага. Функцыі ачышчэньня і бар'еру ў праграмах Гербалайф выконвае мноства таблетаваных комплексаў зь зёлак пераважна з экалягічна чыстага высакагор'я Тыбэту, а атрыманьне кожнай вузай усяго, што ёй трэба, забясьпечвае так званы "коктэйль" – бялкова-вітамінна-мінэральны комплекс для прыгатаваньня напояў розных смакаў, які распрацаваны паводле тэхналёгіяў зь лябараторыяў НАСА для амэрыканскіх астранаўтаў. Калі ж кожная вуза нашага арганізму вымытая, абароненая і накормленая – нармалізуецца абмен рэчываў, узмацняецца імунная сыстэма і ўвесь арганізм як цэлае пачынае вырашаць мноства сваіх праблемаў са здароўем, у тым ліку зь лішняй ці недастатковай вагой. Да таго ж істотна зьмяншаецца калярыйнасьць рацыёну за кошт замены часткі звычайнай ежы нізкакалярыйным кактэйлем, якасьць харчаваньня пры гэтым нават паляпшаецца (так адна порцыя кактэйлю 25 г – задавальняе дзённую патрэбу ў шэрагу вітамінаў і амінакісьлінаў), і адначасова паскараецца перапрацоўка тлушчаў на энэргію і ваду. У выніку чалавек тройчы на дзень п'е "фасолінкі" зёлак, адзін ці два разы п'е вельмі смачны кактэйль, адпаведна два ці адзін раз есьць звычайную ежу выпівае 2,5–3 літры вадкасьці, не адчувае голаду, бадзёра сябе адчувае – і камфортна худзее ад 5 да 15 кілаграмаў за месяц Дасягнуты ўзровень вагі пры разумных далейшых паводзінах нават без праграмы рэабілітацыі часта трымаецца доўгі тэрмін



Усе вышэйназваныя дамешкі, уяўляючы сабой экстракты расьлінаў, мэтанакіравана ўплываюць на розныя бакі жыцьцядзейнасьці арганізму. Таму падбіраць камплект трэба індывідуальна.

Небясьпечныя лекі

Лінкаміцын (агульнапрынятая назва **лінкацын**)

Банглядэш. Паводле умоваў кантролю над лекавымі сродкамі, лінкаміцын унесены ў сьпіс лекаў абмежаванага выкарыстаньня, яго дазволена вырабляць у абмежаваных колькасьцях у адпаведнасьці з парадамі доктароў-спэцыялістаў і ўжываць толькі па абмежаваных паказьніках. Паводле некаторых зьвестак, лінкаміцын выклікае псэўдамэмбранозны каліт.

Грэцыя: Пасьля зьяўленьня публікацыяў пра выпадкі псэўдамэмбранознага каліту, выкліканага антыбіётыкамі кліндаміцынам і лінкаміцыном, паказаньні да ўжываньня гэтых лекаў абмяжоўваюцца хваробамі, пры якіх іншыя антыбіётыкі неэфэктыўныя.

Камэнтар Сусьветнай Арганізацыі Аховы Здароўя (СААЗ):

Паведамлялася, што у некаторых выпадках ужываньне антбіётыкаў шырокага спэктру дзеяньня – кліндаміцыну і лінкаміцыну – выклікала псэўдамэмбранозны каліт, які разьвіваецца у выніку вельмі інтэнсыўнага росту ўстойлівых формаў Clostridium difficile. Гэтыя два лекавыя сродкі застаюцца шырока даступнымі, але іх ужываньне звычайна абмяжоўваецца цяжкімі хваробамі, якія маюць пагрозу для жыцьця

Фуразалідон

Японія: Выключэнь зь ліку усіх прэпаратаў, якія паступаюць у продаж, у сувязі з тым, што быў выцесьнены больш бясьпечнымі і тэрапэўтычна эфэктыўнейшымі прэпаратамі (з 1977 г.).

Філіпіны: Зацьверджаны толькі для абмежаванага выкарыстаньня. Выпрабаваньні на жывёлах паказалі, што гэты лекавы сродак валодае канцэрагенным патэнцыялам. На цэтліках усіх прадуктаў павінна быць надрукаваная перасьцярога (з 1980 .).

Італія: На цэтліках надрукавана наступная перасьцярога: "Грунтуючыся на звестках выпрабаваньняў прэпарату на жывёлах, фірма раіць толькі кароткатэрміновыя курсы лекаваньня пад назіраньнем доктара" (з 1982 г.)

Камэнтар Сусьветнай Арганізацыі Аховы Здароўя. Ацэнкі суадносінаў ступені бясьпекі і спрыяльнага ўзьдзеяньня фуразалідона – вытворнага нітрафурона неаднолькавыя. Тым ня менш, гэтыя прэпараты застаюцца шырока даступнымі у шматлікіх краінах, дзе іх ужываюць для лекаваньня дыярэі і энтэрытаў, што ўзбуджаюцца бактэрыямі найпрасцейшымі.

Надрукаваныя матэрыялы прэзентаваны ААН і змешчаны ў Зборным сьпісе тавараў ужываньне і/ці продаж якіх забаронены ці абмежаваны

Перш чым купіць цацку, панюхайце!

Цяжка зразумець, чаго дамагаецца вытворца, тыражуючы гэтых прывабных пупсаў парадаваць дзяцей ці крыху іх патруціць? Бо нават пасьля непрацяглае гульні зь імі у Вашага дзіцяці пачнецца кашаль з вачэй палюцца сьлёзы і яно будзе вельмі ўзбуджана

А в ною ўсяму фармальдэгід, воцатнь і кратонавы альдэгіды – шкодныя для здароўя рэчывы, што выклікаюць раздражненьне сьлізьніцы вачэй і верхніх дыхальных шляхоў, узбуджаюць нэрвовую сыстэму Яны былі у вялікай колькасьці зноидзены ў гэтых цацках пры лябараторных дасьледаваньнях. Дадамо што гэтыя цацкі, выробленыя ў Кітаі, у менскія крамы трапілі праз Польшчу.

А яркія вясёлыя надзіманыя зьвераняты, таксама дарэчы, кітайскай вытворчасьці, як высьветлілася яшчэ шкаднейшыя за папярэднія. Зьмесьціва сьвінцу і хрому перавышала ПДК (памежна дапушчальную канцэнтрацыю) утрая! Гэтыя рэчывы ня проста шкодныя для здароўя – яны згубна ўплываюць на генафонд чалавека.

Дык што ж рабіць бацькам, калі яны жадаюць купіць дзіцяці новую цацку? Найперш цацку трэба панюхаць. І калі яна мае моцны пах які выклікае непрыемнае адчуваньне – купляць такую цацку ня варта. Акрамя таго, перад купляй трэба папрасіць у прадаўца ці адміністратара крамы сэртыфікат бясьпекі. Бо дзіцячыя цацкі ўваходзяць у сьпіс тавараў, якія абавязкова мусяць праходзіць экспэртызу на бясьпеку!



Інвэстыцыйныя фонды: некалькі парадаў дробнаму ўкладальніку

Сёньня на Беларусі існуюць 2 тыпы ўстановаў, што зьбіраюць ваўчары у абмен на свае акцыі.

Па-першае, гэта так званыя "спэцыялізаваныя інвэстыцыйныя фонды прыватызацыі, што акумулююць прыватызацыйныя чэкі грамадзянаў" – іх звычайна й называюць "чэкавыя фонды".

Па-другое, існуюць розныя ўстановы, якія таксама займаюцца зборам чэкаў у грамадзянаў, але ня ёсьць спэцыялізаванымі.

Заканадаўства

Усе чэкавыя фонды зарэгістраваныя ў адпаведнасьці са спэцыяльным заканадаўствам аб прыватызацыі, якое досыць жорстка рэглямэнтуе іхнюю дзейнасьць, і працуюць зь дзяржаўнай ліцэнзіяй. Нягледзячы на тое, што яны працуюць ва ўмовах фіскальных законаў і прэсінгу выканаўчай улады, на жаль, некаторыя зь іх таксама парушаюць заканадаўства пры сваёй дзейнасьці.

Варта памятаць, што фонд-парушальнік можа быць у кожны момант пазбаўлены ліцэнзіі і тым самым спыніць сваё існаваньне. (Прыклады ў Беларусі ўжо існуюць).

Калі чэкавыя фонды Вам недаспадобы

Магчымасьці выкарыстаньня чэкаў "Маёмасьць" неспэцыялізаванымі ўстановамі вельмі разнастайныя. Пры гэтым такія ўстановы не рэглямэнтуюцца і не кантралююцца, як гэта робіцца адносна спэцыялізаваных фондаў), у прыватнасьці, не праходзяць ліцэнзаваньне. Укладаньні чэкаў у іх болей рызыкоўныя, чым у спэцыялізаваныя чэкавыя фонды. Але й даходнасьць можа быць большай.

Некалькі парадаў тым, хто вырашыў скарыстацца паслугамі неспэцыялізаваных установаў:

– папрасіце паказаць вам Статут і іншыя ўстаўныя дакумэнты. Уважліва вывучыце свае правы і абавязкі ўстановы перад вамі, удакладніце сумнеўныя пытаньні. Адмова паказаць Вам гэтыя дакумэнты і патлумачыць сумнеўныя моманты – недвухсэнсоўны сыгнал, што лепей укласьці чэкі ў іншае месца.

– уважліва прачытайце паперы, якія Вам трэба падпісаць. Ці адпавядае іх зьмест таму, што Вам абяцаюць на словах? Калі знойдзеце разыходжаньні – патрабуйце тлумачэньня. Калі сустракаеце непаразуменьне – сыходзьце.

– высьветліце, як зьбіраецца установа выкарыстоўваць чэкі, за кошт чаго плаціць дывідэнды. Зусім ня трэба супрацоўнічаць з установай, якая абвяшчае схемы сваёй дзейнасьці камэрцыйнай таямніцаю.

Ня трэба шкадаваць, што ў выніку выкананьня гэтых парадаў не атрымаецца ўкласьці чэкі ва ўстановы, чые паслугі ці акцыі карыстаюцца ажыятажным попытам. Людзям уласьціва памыляцца

Як выбіраць

Спэцыялізаваныя чэкавыя фонды маюць права ажыцьцяўляць толькі адзін від інвэстыцыяў – набываць каштоўныя паперы. Таму абяцаньні ўкласьці чэкі ў зямлю, нерухомасьць ці нафтавыя вышкі (якія не прыватызуюцца) ня трэба прымаць літаральна.

Пры выбары фонду трэба кіравацца не ягонай назвай і мастацкасьцю ваканаўня рэклямы, а ацэнкамі дзейнасьці фонду, якія даюць незалежныя экспэрты.

Што глядзець у Статуце

Калі Вы прыйшлі ў фонд, перш чым укладаць чэк, папрасіце паказаць Вам Статут фонду, праспэкт эмісіі і спытайце, дзе надрукавана фінансавая справаздача пра дзейнасьць фонду (папрасіце паказаць газэту ці часопіс) Гэтыя паперы павінны быць у кожным абменным фондзе й пазнаёміцца зь імі можа кожны ахвочы.

Трэба праверыць наяўнасьць у Статуце й праспэкце эмісіі наступных пунктаў:

– Вашага права ўдзельнічаць у сходах акцыянэраў асабіста ці праз прадстаўніка, выключнай кампэтэнцыі агульнага сходу акцыянэраў уносіць зьмены й дадаткі ў Статут фонду, зацьвярджаць парадак разьліку дывідэндаў і прымаць рашэньне пра ліквідацыю фонду;

Вашага права прадаваць акцыі фонду трэцім асобам;

– Вашага права атрымліваць дывідэнды пры ўмове прыбытковай дзейнасьці фонду не радзей за адзін раз на год;

– Вашага права штоквартальна атрымліваць інфармацыю пра дзейнасьць фонду і абавязкі фонду штоквартальна друкаваць у сродках масавай інфармацыі прадугледжаную заканадаўствам справаздачнасьць.

Важнасьць справаздачнасьці

Катэгарычна ня раім укладаць ваўчары ў фонды, якія не публікуюць сваіх справаздачаў ці друкуюць іх ня цалкам. Закрытасьць інфармацыі, апроч недаступнасьці яе для незалежнай экспэртызы і парушэньня закону, можа значыць, што фонду ёсьць што хаваць

Што пытаць

У кожным абменным пункце пры стойнага фонду павінен быць кансультант, які адкажа на ўсе цікавыя для Вас пытаньні. Варта спытаць пра наступнае:

1. Зь якіх крыніцаў фонд кампэнсуе свае выдаткі (на арэнду, аплату пэрсаналу, рэкляму і г. д.)? Кепска, калі шляхам продажу часткі сабраных чэкаў, і зусім падазрона, калі Вам адкажуць, што фонд ужо мае прыбытак ад каштоўных папераў, у якія былі ўкладзеныя сабраныя ваўчары.

2. Калі Вы ўкладаеце ваўчары у фонд, які ўжо пачаў выплочваць акцыянэрам дывідэнды, то абавязкова спытайце – за кошт чаго робяцца гэтыя выплаты. Магчыма, што крыніца вам не падыдзе.

Што неадназначна

Склад заснавальнікаў – адна з найбольш сутнасных характарыстык фонду. Але сам сабой ён ня кажа ні "за", ні "супраць". Калі фонд спадабаўся Вам ме навіта складам заснавальнікаў, то абавязкова праверце адпаведнасьць рэклямнай інфармацыі Статуту й праспэкту эмісіі – былі выпадкі, што інфармацыя не супалала.

У адрозьненьне ад выпадку ўкладаньня ваўчараў у неспэцыялізаваныя установы, Вам ня трэба асабліва хвалявацца з нагоды выдаванага дакумэнту. Гэта можа быць пасьведчаньне, сэртыфікат, акцыя ці што іншае. Адзінае, на што трэба зьвярнуць увагу, – у дакумэнце не павінна быць аніякіх запісаў пра Вашу адмову ад нейкіх правоў (на дывідэнд, голас, удзел у сходзе акцыянэраў і г. д.). Акрамя таго, калі Вам на словах былі абяцаныя нейкія дадатковыя паслугі (кватэра, лятарэя, паездка за мяжу і г. д.), то гэта абавязкова павінна быць запісана ў атрыманым Вам дакумэнце.

На што не зьвяртаць увагі

Бясьпека Вашых унёскаў і даходнасьць фонду зусім не залежаць ад месца разьмяшчэньня офісу й абменных пунктаў фонду, памеру эмісіі, намінальнага кошту і колькасьці акцыяў што выдаюцца на адзін чэк, назвы дэпазытара фонду.

Што не рабіць

Некаторыя фонды, перш чым выдаць Вам акцыю, патрабуюць падпісаць дакумэнт, адпаведна зь якім Вы перадаеце свой голас на сходзе акцыянэраў Радзе дырэктараў фонду. У выніку гэтых дзеяньняў Рада дырэктараў фонду становіцца зусім бескантрольнай, што не абяцае Вам нічога добрага. Мы катэгарычна ня раім укладаць чэкі ў такія фонды, калі ў гэтым дакумэнце не сказана пра Вашае права ў кожны момант абвясьціць яго нядзейсным

Дык што ж рабіць

У Беларусі на цяперашні час зарэгістравана некалькі чэкавых фондаў. Малаверагодна, што ўсе яны выжывуць. Але гэта не азначае, што да ўкладаньня чэкаў ў фонд трэба ставіцца як да сродка пазбаўленьня ад жахлівага пытаньня: што рабіць з ваўчарам. Такое стаўленьне – на карысьць толькі махлярам.

Чэкавыя фонды будуць існаваць ня год, ня два і нават ня 10. Іхныя акцыі атрымаюць у спадчыну Вашыя дзеці і ўнукі. Дык пастаўцеся сур'ёзна да магчымасьці выбраць. Толькі гэта можа гарантаваць слушнасьць выбару

Вы сабраліся ў адпачынак

Кожны з нас марыць добра адпачыць. Нехта едзе з намётамі на прыроду, нехта адпачывае на лецішчы. Нашы парады для тых, хто любіць вандраваць і карыстаецца паслугамі турыстычнага бюро.

Уважліва азнаёмцеся з буклетамі и фотаздымкамі мясцовасьці, куды думаеце ехаць, атрымайце ў турбюро як мага больш поўную інфармацыю, каб пераканацца, што менавіта у гэтых мясьцінах Вы хацелі б адпачываць.

Калі Вы едзеце зь дзецьмі, пракансультуйцеся зь лекарам, ці падыходзяць кліматычныя умовы для Вашых дзяцей.

Перш чым набыць вандроўнае накіраваньне, даведайцеся поўную назву і юрыдычны адрас турыстычнае ўстановы.

Калі зьвестак, што напісаныя у накіраваньні, Вам недастаткова, не саромцеся ўдакладніць тое ці іншае пытаньне. Лепш, калі Вам прапануюць прачытаць і падпісаць пісьмовую дамову аб турыстычным абслугоўваньні ў гатэлі, санаторыі і г. д. Бо набыўшы накіраваньне без дамовы, Вы рызыкуеце моцна расчаравацца у прыкрасах мясцовасьці, куды паедзеце адпачываць, у клясе абяцанага гатэлю, у якасьці абслугоўваньня и харчаваньня. Апроч таго, не падпісаўшы дамовы, Вы ня зможаце падаць турыстычнай фірме прэтэнзіі з нагоды якасьці турыстычных паслугаў, бо гэтыя ўмовы звычайна у накіраваньні не абумоўліваюцца.

Маючы на руках дамову, Вы будзеце пераканаными, што Вас не падмануць і выканаюць усё, што абяцаюць, а пры невыкананьні ўмоваў дамовы кампэнсуюць Вашыя пакуты.

У дамове павінны быць пазначаны наступныя зьвесткі:

– дата падпісаньня дамовы,

усе рэквізыты турыстычнага бюро;

– тэрмін, на які Вы едзеце

– від транспарту да месца адпачынку и назад

– кляса гатэлю ці санаторыя, ягоная назва, разьмяшчэньне

у якіх нумарах разьмяшчаюцца турысты

– паслугі, якія уваходзяць у кошт накіраваньня (харчаваньне, саўна, экскурсіі і г. д.)



– кошт адпачынку;

– адказнасьць бюро за няякаснае абслугоўваньне (магчыма і ў грашовай форме, а таксама ў замене аднаго абавязку іншым, напрыклад бясплатны выезд у іншае месца).

Калі Вам у турыстычным бюро не прапанавалі падпісаць дамову, то можаце напісаць яе самі ў двух асобніках і прапанаваць падпісаць дырэктару фірмы

Пацьверджаньнем падпісаньня дамовы можа быць накіраваньне разам з квітанцыяй аб аплаце. Калі Вы едзеце за мяжу, то на кожны від паслугаў Вам абавязаны выдаць асобныя квітанцыі (за афармленьне замежнага пашпарту, пражываньне у гатэлі, квіткі й г. д.). Калі за паслугі Вы заплацілі валюту, то гэта абавязкова павінна быць адлюстравана ў квітанцыі

Калі раптам турыстычная фірма ня спраўдзіць Вашых чаканьняў, то у першы ж дзень адпачынку Вы можаце скасаваць дамову, вярнуцца і патрабаваць вяртаньня кошту накіраваньня і аплаты маральнае шкоды. Калі Вы застанецеся адпачываць, то па прыезьдзе маеце права патрабаваць кампэнсаваць Вам розьніцу за пражываньне ня ў той клясе гатэлю ці за кепскае харчаваньне, калі было абяцана добрае і г. д.

Найхутчэй Вашы патрабаваньні супрацоўнікі турбюро ня выканаюць. Тады зьвяртайцеся у суд і, акрамя матэрыяльнае кампэнсацыі, патрабуйце спагнаньня маральнае шкоды.

Вам жа сапсавалі адпачынак!

Пыркі шампанскага

Вядома, шампанскае павінна быць толькі францускім! — так, верагодна, думаюць многія, і таму францускае шампанскае "Yves Roche" ідзе вельмі добра. Але, як ні горка, давядзецца расчараваць такіх зацятых прыхільнікаў "сапраўднага" шампанскага. На жаль, набываюць яны ня толькі не францускае, але и не шампанскае і нават не віно, а ўсяго толькі "штучны алькагольны шыпучы напой", зроблены ў Нямеччыне. Хаця дзеля справядлівасьці трэба сказаць, што смак у гэтага напою вельмі прыемны.

Вось да якіх высноваў прыйшлі спэцыялісты, якія рабілі ягоную экспэртызу:

"Прадукт уяўляе сабою водную рашчыну зь вялікаи колькасьцю цытрынавай кісьліны, араматызатара, сьпірту, напой узбагачаны вуглекісьлінай. Вінаградныя вінаматэрыялы, якія выкарыстоўваюцца для вырабу шампанскага і пеністых вінаў, арганалептычна не выяўлены. Гэты прадукт ня можа быць аднесены да тыпу шампанскага віна"

А ведаеце, на што "купляюць" давερлівых грамадзянаў вытворцы гэтага напою? Схема простая й разьлічаная на нашыя з Вамі ўмоўныя рэфлексы.

Па-першае, вонкавы выгляд бутэлькі: у шэрагу іншых шампанскіх вінаў гэта выглядае як шампанскае — такая самая бутэлька, уласьцівы шампанскім вінам корак, такая самая фальга, вельмі падобны цэтлік.

Па-другое, замежны цэтлік: мы непапраўныя прыхільнікі ўсяго замежнага

Па-трэцяе, гучная назва: "Yves Rocher" — знакамітая фірма, якая мае высокі рэйтынг у нашай сьвядомасьці. Праўда, вырабляе яна

касмэтыку, і ейная назва на бутэльцы ўзноўлена з памылкай, але хто зьвяртае ўвагу на такія дробязі?

І па-чацьвертае, шампанскае выдаецца за францускае, гэта значыць самае што ні ёсьць "роднае": і на цэтліку і на штрыхавым кодзе пазначана Францыя (нумар 34).

Гэта тыя пасткі, на якія трапляемся мы, пакупнікі. Але ёсьць пасткі, якія вытворцы "Yves Roche" расставілі для прадаўцоў. Гэта, у прыватнасьці, сэртыфікат, выдадзены Таварыствам сэртыфікацыі ў Эуропе DIN GOST TUV Berlin-Brandenburg, які прыкладаецца да партыяў "Yves Roche" і ў якім значыцца "віно пеністае"

Тут трэба зрабіць заувагу. Тое, што мы з Вамі прызвычаіліся называць Шампанскім", насамрэч называецца пеністым віном. Шампанскім па справядлівасьці можа называцца толькі пеністае віно, выраблене ў францускай правінцыі Шампань. Але тэхналёгія вырабу шампанскіх і пеністых вінаў практычна не адрозьніваецца. Таму прадаўцы, якія старанна выводзяць на цэньніках кожнага пеністага віна "Шампанскае", ня вельмі грашаць супраць праўды.

Выраблюць "Yves Roche" на нямецкім заводзе першаснага вінаробства ў Трыры, вытворца — фірма "Санкт Леанард Вайнкелерай ГмбХ і К°". І хаця Германскаму таварыству барацьбы зь нядобрасумленнай канкурэнцыяй даўно вядома, што сапраўды знаходзіцца ў прыгожых бутэльках, і спэцыялізаваная нямецкая прэса не аднойчы прайшлася на гэтую тэму, нямецкія ўлады прыйшлі да высновы, што штучнае шампанскае цалкам мае права на існаваньне й вытворчасьць яго спыняць ня трэба. Іншая рэч, што афармленьне бутэлек, якое уводзіць у зман пакупнікоў, трэба зьмяніць — такое рашэньне суда, які адбыўся ў Нямеччыне. Сваім рашэньнем Найвышэйшы адміністра-



тыўны суд зямлі Райнлянд Пфальц таксама забараніў выпуск алькагольных напояў "Yves Roche" у рэалізацыю ў краіны былога ўсходняга блёку, дзе і збываецца гэты напой.

А вось што датычыцца назвы Yves Roche, то ейнае зьяўленьне на бутэльках пакрыта цемраи. Кіраўнікі францускіх лябараторыяў расьліннай біялёгіі "Yves Rocher", што выробляюць і прадаюць касмэтычную вытворчасьць, афіцыйна



заявілі, што іхная фірма нічога агульнага з "Шампанскім" не мае

На гэтым здымку пададзеныя напоі, якія, паводле заключэньня экспэртаў Саюзу германскіх вінаробаў, таксама ня ёсьць шампанскімі вінамі

Ці ведаеце Вы псыхалёгію мужчыны й жанчыны?

Калі Вы згодныя з прыведзенымі меркаваньнямі, то пастаўце знак "+", калі не згодныя – знак "–".

1. Жанчына бардзей кахае, чым мужчына.

2. Мужчына менш, чым жанчына, схільны да захоўваньня на браклы.

3. Жанчына болей, чым мужчына, можа жыцца [illegible] жыцьцём.

4. Мозаг мужчынаў большы вагой больш за мозаг жанчыны.

5. Жанчыны больш схільныя прымаць усё на сябе.

6. У мужчынаў значна лягчэй, чым у жанчынаў, пахіснуць упэўненасьць у сабе.

7. Мужчыне надае шлюбнасьць значна менш увагі, чым жанчына.

8. У жанчынаў часьцей бывае язва страўніка.

9. Мужчына сваім справам надае больш грамадзкую значнасьць, чым жанчына.

10. Мужчына значна больш непаслядоўны й шчыры, чым жанчына.

11. Мужчынам для ўмацаваньня [illegible] болей, чым жанчынам, трэба [illegible] і маёмасьці.

12. Мужчынаў памяць [illegible], чым жанчынаў.

13. Паводле статыстыкі, жанчыны часьцей, чым мужчыны, ідуць на самагубства.

14. Сярод мужчынаў менш заікаў, чым сярод жанчынаў.

15. Сярод геніяў болей мужчынаў, чым жанчынаў.

16. Мужчыне [illegible] зьмым склацць, чым жанчыне.

17. Мужчына значна ўспрымаюць гумар, чым жанчына.

18. Мужчына значна [illegible] за жанчыну пераносяць боль.

19. Мужчыны радзей за жанчынаў сыходзяць з дома, уступаюць у [illegible] канфлікты з сваімі блізкімі.

20. У восторных сітуацыях, што патрабуюць хуткіх рашэньняў, мужчыны рэагуюць хутчэй, чым жанчыны.

21. Мужчынам цяжэй, чым жанчынам, трымацца дыеты.

22. Мужчыны больш зацікаўлены за жанчынаў.

23. Мужчыны дамагаюцца большых жыццёвых поспехаў у параўнаньні з жанчынамі.

24. Мужчыны больш за ўсё любяць жанчыне падпарадкоўвацца.

25. Калёкаў больш "жаночых", чым [illegible].

26. Мужчынам болей падабаюцца дарлаўка, чым [illegible].

27. У жанчынаў [illegible] мужчыны [illegible] звяртаюць увагу на верхнюю частку фігуры.

28. Мужчыны больш за жанчынаў схільныя да [illegible].

29. Для мужчынаў уласьцівы [illegible], для жанчынаў [illegible].

30. Жанчынам [illegible] мужчынам рацыянальнасьць [illegible] розум.

31. Мужчыны больш імпульсіўныя, не абачлівыя й легкаверныя, жанчыны – стрыманыя й абачлівыя.

32. Мужчыны часьцей праяўляюць уменьне ўваходзіць у сутнасьць справы, жанчыны – больш паверхоўныя.

33. Жанчыны – рашучыя, мужчыны часьцей выказваюць асцярожнасьць.

34. Для жанчынаў характэрна зьменлівасьць, для мужчынаў – настойлівасьць.

35. Мужчыны больш самаўпэўненыя, чым жанчыны.

36. У жанчынаў актыўнасьць пераважае над пасіўнасьцю, а ў мужчынаў – наадварот.

37. Мужчыны часьцей выяўляюць эгаізм, імкнуцца да камфорту, жанчыны – [illegible], цягнуцца да ахвяраваньня сабой.

38. Жанчыны больш велікадушныя, мужчынам уласьціва зайздрасьць.

39. Мужчыны часьцей выяўляюць цікаўнасьць, жанчыны – абыякавасьць.

40. Жанчыны больш прывязаныя да дому, мужчыны больш захопленыя справамі працы, стварэньнем шырокага кола грамадзкіх сувязяў.

За кожны адказ, які супадае з "ключом", пастаўце сабе адзін бал.

Ключ: 1. Так. 2. Не. 3. Не. 4. Так. 5. Так. 6. Так. 7. Не. 8. Не. 9. Так. 10. Так. 11. Не. 12. Не. 13. Не. 14. Не. 15. Так. 16. Так. 17. Так. 18. Не. 19. Так. 20. Так. 21. Не. 22. Так. 23. Так. 24. Так. 25. Не. 26. Не. 27. Так. 28. Так. 29. Не. 30. Так. 31. Не. 32. Так. 33. Не. 34. Так. 35. Так. 36. Не. 37. Так. 38. Не. 39. Не. 40. Так.

Падсумуйце балы.

Да 12 балаў. Для Вас мужчына й жанчына – таямніца, вывучайце слушныя адказы.

12-20 балаў. Нешта пра мужчынаў і жанчынаў Вы ведаеце, але далёка не ўсё. Старайцеся вывучаць іх больш рацыянальна й на працы, і дома, і ў эмацыйным жыцьці.

21-32 балы. Знаемая сітуацыя! Яшчэ крыху, і Вы будзеце чытаць у іхнай душы, як у разгорнутай кнізе.

33-40 балаў. Вы [illegible] у жаночых і мужчынскіх пытаньнях. Адчуваеце мужчынаў і жанчынаў беспамылкова. Такое разуменьне мужчынскай і жаночай псыхалёгіі прыносіць шчасьце ў сямейным жыцьці.

У ПАПЯРЭДНІХ НУМАРАХ (№1 – 20).

Кошты на менскіх рынках: Камароўка (ІНФ. №1, 7, 10, 21), Рэчавы рынак "Дынама" (ІНФ. №2, 8), Аўтарынак (ІНФ. №3, 12), Кошты на кампакт дыскі (ІНФ. №4), Кошты на кватэры ў Менску. Кошты на офісы (ІНФ. №5, 17), Кошты на будаўнічыя матэрыялы (ІНФ. №6), Кошты на камп'ютары. Менск (ІНФ. №9), Кошты на філязофска-гуманітарную літаратуру (ІНФ. №18).

Транспарт: Расклад руху пасажырскіх цягнікоў ад станцыі Менск Пасажырскі (ІНФ. №1, 15), Расклад руху прыгарадных цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФ. №2, 12), Расклад руху аўтобусаў ад а/с Менск Цэнтральны і Менск Усходні (ІНФ. №3, 16, 17), Расклад рэйсаў пасажырскіх самалётаў. Усё пра аўтазаправачныя станцыі (ІНФ. №5).

Адукацыя: Замежнае навучаньне ў 1996 годзе (ІНФ. №1), Платнае навучаньне ў Менску. Камэрцыйныя ВНУ (ІНФ. №2), Дзяржаўныя ВНУ. Платнае навучаньне (ІНФ. № 3-4). ВНУ. Акадэміі (ІНФ. №8, 10).

Біржа працы: Аналіз стану рынку працы паводле зьвестак Менскага гарадзкога цэнтру занятасьці насельніцтва (ІНФ. №1-9). Новыя вакансіі й прадукцыйныя месцы па Беларусі (ІНФ. №1-21).

Адпачынак: Вучымся гуляць у прэфэранс (ІНФ. № 1-15), Вучымся гуляць у більярд (ІНФ. № 16-22). Тэсты, шахматныя й інтэлектуальныя задачы (ІНФ. №1-22).

Спажывец: Тэлефонныя коды гарадоў Беларусі, краінаў ды іншага далёкага замежжа (ІНФ. №2); Твае правы, пакупнік (ІНФ. №2), Як купляць і прадаваць кватэру. Што азначае спэцыяльнае маркіраваньне (ІНФ. №3), Мера ўлады сапраўдны каляндар (ІНФ. №4), Як вызначыць якасьць мясных і рыбных прадуктаў (ІНФ. №5), Пра новыя долары. Праўда пра цыгарэты. Штрыхавы код – як яго расшыфраваць (ІНФ. №6), Як выбіраць абутак (ІНФ. №7), Міжнародная сыстэма памераў (ІНФ. №10), Каб вырасьлі рыба вялікая (ІНФ. №11), Як набыць аўтамабіль у Нямеччыне (ІНФ. №18 Заканчэньне), Вучымся эканомна кіраваць аўтамабілем (ІНФ. № 12, 15, 17), Зрабі сам (ІНФ. № 16), Соньік (ІНФ. № 15, 17, 18 Заканчэньне), Спажывецкі тэст – прасы (ІНФ. № 20), Спажывецкі тэст – тэлевізары (ІНФ. № 21), Кошты на аўто ў Польшчы (ІНФ. № 21, 22).

Інструктар: Друкарня ў кожнай кватэры. [illegible] родную школу. Займаемся ўпадарожжа (ІНФ. № 19).

Здароўе: Першы зьвяртацца да лекара. Як кінуць паліць (ІНФ. №4), Прыродныя атруты (ІНФ. №10), Атлетычныя клюбы, шэйпінг, аэробіка, тэнісныя корты (ІНФ. №18), Комплексная ацэнка забруджаньня асяродзьдзя Менску і вобласьці (ІНФ. № 19), Тэст. [illegible] (ІНФ. № 22), Небясьпечныя лекі (ІНФ. № 22), Пра шкоду пасіўнага паленьня (ІНФ. № 22).

Гаспадарка: Газ у нашым доме. Як чытаць цэтлікі на вопратцы (ІНФ. №5), ЖЭС. Рамонт жытла. Пункты прыёму зваротаў на будаўнічарамонтныя працы (ІНФ. №6), Як мяняць кватэру. Калі залію кватэру... (ІНФ. №8), Як пабудаваць садовы домік. Дом і дачанька (ІНФ. №9).

Грамафон: Старонка вершаванага радка (ІНФ. №6, 8, 11, 17, 19, 20).

Харчаваньне: Якую гарбату мы п'ем. Пра [illegible] (ІНФ. №7), Бары, рэстараны, кавярні Менску (ІНФ. №15).

Спорт: [illegible] (ІНФ. №7, 9, 19).

Бібліятэка: Новыя паступленьні ў кнігарні (ІНФ. №9, 10, 11, 15, 16, 18-22).

За мяжою: Хто ты [illegible], Пастаўленьне з навучальнымі ўстановамі ЗША (ІНФ. №17).

Беларусь і сьвет. Індзейцы ў Беларусі (ІНФ. № 21).

Адвакат: Агляд правоў чалавека. Міжнародная Амністыя (ІНФ. №17).

ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫХ НУМАРАХ

Рынак: Новыя кошты на розныя тавары

Адукацыя: Адукацыя ў ЗША (працяг)

Грамафон: Новыя вершы нашых чытачоў



БІЛЬЯРД

ЗАНЯТАК 7

(Працяг. Пачатак у N 16)

Калі неабходна выканаць празьмерную "рэзку" у лузу з прыканага ад гульца борта, то ў біяк б'юць крутым правым "эфа". Выкан удару аналягічны папярэдняму.

Удары ў бартавыя шары. Лічыцца, што бартавыя шары, якія стаяць усутыч да борта, на строгім більярдзе з правільнымі лузамі (більярдны прымет [illegible] рад) і добра [illegible] шарамі ня мусяць гуляцца ў кутнія лузы. Такія шары можна гуляць, калі гульня адбываецца на стале, у якога лузы мошна [illegible] ці вусьце лузы мае [illegible] форму. Апрача таго, у асобных месцах яшчэ можна сустрэць так званыя гульні на пузавых більярдах, у бортаў (у раскі кутнік лузаў) іх [illegible] стала адмыслова звужаная. Праз гэта бартавы шар, накіраваны да лузы, нібыта прагортаецца да яе і нават па іх, не [illegible] дакладным ударам можа быць згуляны.

Прынята [illegible], што гульцы не могуць [illegible] бартавы простыя шары, адсунутыя ад "вугла" лузы, а таксама шар, які стаіць каля борта ў сярэдзіне, апроч цу[illegible] вялікага майстэрства [illegible] ўмяшаны [illegible].

У [illegible] варыянце [illegible] удалося, як [illegible] у бартавы шар. Вось [illegible] шару на [illegible].

Бартавы шар [illegible] борта [illegible] удараць біткам [illegible] ляць яго са стала, падаць угару (мал. 13). Але неабавязкова, каб бі-



так дакранаўся да борта, удар – "накат" ці кінштос пакідае моцы.

[illegible] бартавы шар з доўгага борта гуляецца лёгкім кінштосам (мал. 14).



Бартавы шар з доўгага борта пакласьці вельмі цяжка. "Свой" трэба пусьціць доўгім "накатам", б'ючы адначасова ў шар і ў борт (мал. 15).



Больш бясьпечна (ня робячы ступную падстаўку) гуляць бартавыя шары, калі трэба біць праз адзін



[illegible] шару (мал. 16). У гэтым разе [illegible] удару біяк застаецца прыкрытым, а гульны шар, нават калі ён не патрапіць у лузу, стане да ў раёне вусьця лузы, [illegible] наступным ударам няцяжка.

Аднак трэба адзначыць, што пры гульні на сталах зь няправільнымі лузамі ці на незнаёмых сталах, а таксама ў заключнай стадыі адказнай гульні гуляць бартавыя шары не рэкамэндуецца. Звычайна такія шары – добрая прынада для [illegible] дасьведчаных спартоўцаў.

Удары ў шары, якія адбіваюцца бартамі. Пры гуляньні шароў, якія адбіваюцца бартамі, трэба памятаць фізычны закон, зь якога (што да більярду) вынікае, што кут падзеньня роўны куту адбіваньня пры простым ударах ("накат", кінштос і "адцяжка"), бо кут падзеньня можа быць ня роўны куту адбіваньня пры баковых ударах.

Усе шары, якія адбіваюцца бартамі, маюць некалькі назваў. Так, удар пры адбіваньні прыцэльнага шара адным бортам называецца дуплетам, двума – трыплетам, трыма – труабанам, чатырма – катрбанам.

Найбольш проста гуляецца роўны дуплет, калі гульны шар стаіць [illegible] да борта, а ўяўныя лініі, праведзеныя ад бітка да гэтага шара і ад яго да лузы, утвараюць раўнабаковы трохкутнік (мал. 17). У гэтым разе шар-мішэню б'юць проста



"[illegible] лоб" [illegible] у самы цэнтар шара.

Сіла ўдару пры гульні простага дуплету ў сярэднюю й кутнюю лузы розная. Дуплет у сярэднюю гуляюць [illegible] ударам, з разьлікам, што калі шар не згуляецца, а стукнецца аб губкі лузы, то ён адыдзе [illegible] і выразнай падстаўкі не атрымаецца.

Дуплет у кут, наадварот, трэба гуляць толькі моцным ударам. Калі згуляць цхім, то пры недакладным удары падстаўка амаль немінучая.

Гуляньне шароў, якія стаяць не пасярэдзіне каля борта ці блізка ад яго, часта выконваецца розаным дуплетам (мал. 18). Гэта ўдар [illegible]



[illegible] У пачатку, калі кут [illegible] ня роўны куту адбіваньня, шар-мішэнь трэба "рэзаць" [illegible] "у лоб". Пры гэтым кут адбіваньня можа быць павялічаны ў параўнаньні з кутам падзеньня.

Розаным дуплетам можна [illegible] найбольш складаныя шары.

Відам дуплету ёсьць удар [illegible], як яго звычайна называюць, "зваротны" (мал. 19). Ён ужываецца, калі



шар-мішэня стаіць усутыч да борта ці на адлегласьці ад яго, ня большай за палову шырыні стала, пад вельмі тупым кутам. Ад "зваротнага" удару біяк абавязкова перасякае лінію падзеньня гульнага шара.

Працяг у наступных нумарах

ШАХМАТЫ



1п. Ход чорных. Ці могуць яны выратавацца?



4п. Ход белых. [illegible]



2п. Ход белых. [illegible]



5п. Ход белых. [illegible]

3п. Ход чорных. Ці могуць яны дамагчыся нічыі?

6п. Ацаніць пазыцыю пры ходзе белых і чорных.

Адказы ў наступным нумары

АДКАЗЫ НА ПАПЯРЭДНІЯ ЗАДАНЬНІ

Шахматы

[illegible]

Кароль — **Кр**

[illegible] — **Г**

[illegible] — **Вж**

[illegible] — **В**

[illegible] — **К**

[illegible]

[illegible] 4. Кра3 Кра6 5. Кра4 [illegible] 1. Кр[illegible] 2. [illegible] Кра6 3. Крb2 Крb6 4. Кра3 Кра5 5. Кра4 [illegible]

Забаўкі

1. 4 **2.** 3 **3.** 39

ЗАБАЎКІ

Задача 1

Устаўце фігуру, якой [illegible]



Задача 2

Падстаўце лік, якога бракуе

42	(44)	38
23	( )	28

Задача 3

Падстаўце лік, якога бракуе

8 10 16 34 ?

Адказ у наступным нумары

Ахвяры традыцыі

У сюжэтах пра чараўнікі сутыкаюцца два сьветы — зямны й інфэрнальны. Вось чаму ў людзей, якія выкрываюць таемныя сілы, такія экзальтаваныя пачуцьці. Але мы маем справу яшчэ з адным ня меншым цудам: пра сувязь з патаемным сьведчаць матэрыяльныя посьбіты — пісьмовыя тэксты.

Адначасова паўстае праблема асабістай адказнасьці за свае [illegible]. Гэтая адказнасьць пэрсаніфікуецца й пераносіцца на канкрэтных людзей. Судовыя ж працэсы сьведчаць, што ня ўсе жанчыны, якія абвінавачваліся суседзямі, прызнаваліся судом вінаватымі ў кантактах з д'ябальскімі сіламі.

Нават у арыентаваных на традыцыяналізм групах ня кожны верыць у існаваньне ведзьмарак, ня кожны імкнецца знайсьці ворага. Але такі скептык не можа выконваць функцыю лідэра ў групе, ягоныя сумневы носяць пасіўны характар, ён ня можа навесьці іх шырокаму колу суразмоўнікаў. Той, хто не падтрымлівае традыцыйнае думкі, ня можа дасягнуць статусу лідэра. Больш за тое, чалавек, паводзіны якога [illegible] маральна этычным стэрэатыпам яго атачэньня, падаюцца неразумнымі й ён сам можа лёгка зрабіцца ахвярай традыцыі. Чалавек ня ў стане растлумачыць усё, што адбываецца навокал яго, але традыцыя тлумачыць усё. І вось чалавек, які добра знаёмы з стэрэатыпамі калектыўнае сьвядомасьці, з сыстэмаю маральна-этычных нормаў, якія складаюць аснову жыцьця арыентаванай на традыцыяналізм групы, можа стаць лідэрам гэтае групы. Падтрымка фальклёрных крыніцаў і наяўнасьць лідэра групы неабходныя для фармаваньня міту ворага, на якога можна сьпісаць усе няўдачы, хваробы ці суполкі. Такім уяўляецца магчымым вытлумачэньне ў [illegible] і індустрыйных грамадзтвах фэномэну вялізнай колькасьці ведзьмарак.

І тут [illegible] вяртаем [illegible] вызначальнай ролі тэксту ва ўсей нашай гісторыі. Грамадзтва Вялікага Княства стварыла унікальную сыстэму судовага разгляду, дзе праз юрыдычныя працэдуры можна было паспрабаваць вырашыць праблемы ўзаемаадносінаў паміж людзьмі й дэманічнымі сіламі, паміж людзьмі й людзьмі, а ўрэшце — паміж лідэрамі традыцыяналісцкіх групаў ды ахвярамі традыцыі. Зафіксаваныя тэкстам, гэткія судовыя эксперыменты рабіліся судовымі прэцэдэнтамі, на якія ўжо можна было спасылацца надалей. Праца Вольгі Бабковай дае нам уяўленьне пра такія выпадкі.

У паданьнях пра ведзьмарак заўжды прысутнічае фальклёрны трохкутнік — Герой, Ахвяра, Антаганіст. Функцыю героя найчасьцей выконвае ведзьмарк[illegible]. Ахвяраю зьяўляецца апавядальнік ці той, хто жыве побач. Антаганіст у фальклёрных казках заўжды праяўляецца акрэсьлена й не патрабуе дадатковай інфармацыі пры кожным новым агучваньні, але ў апавядах пра ведзьмарак для антаганіста неабходныя ўдакладненьні. Дык вось, праз тэксты судовых працэсаў гэты трохкутнік цалкам пераносіцца ў структуру судовага працэсу — тут ёсьць той, хто нясе скаргу, ёсьць абвінавачаны, [illegible] суд выступае [illegible] сьвецкім антаганістам адносна іншых бакоў. Тэкст супастаўляе і ўзмацняе сувязі паміж фальклёрам ды афіцыйнай пісьменнай культурай.

Судовыя тэксты сьведчаць пра ўзровень праўнай сьвядомасьці грамадзянаў Вялікага Княства. У судзе гэтае дзяржавы можна было разглядаць самыя складаныя справы; з нагоды кожнага важнага выпадку грамадзяне ішлі ў суд. Не заўжды суд мог быць справядлівы і кампэтэнтны, але сам факт існаваньня такой незалежнай інстанцыі вылучаў адасобленыя страты ў грамадзтва.

Калі ёсьць суд, то можна засьцерагчыся нават ад дэманічных сілаў.

Алег Дзярновіч

Чарадзейства

Матэрыялы старых беларускіх актавых кніг

Чур неба, чур зямля, чур зьвезды, чур луна!
А ты, акаянная, стой, [illegible] места!

(з народнага)

[illegible]

Слоўнік старабеларускай актавай мовы.

вазнь — [illegible]
выздыхане — [illegible]
горлом карати — [illegible]
горячий учинок — [illegible]
дей — [illegible]
заябити — [illegible]
запиваный — [illegible]
нешпорная гадзіна — [illegible]
отповед — [illegible]
пофалка — [illegible]

Вольга Бабкова

Славамір Адамовіч

Рэпартаж з 4-й камэры

Проста скво

Заканчэньне. Пачатак у №22

З паказаньняў сьведкі па крымінальнай справе №182

Прозьвішча. Галоўка. Імя. Глафіра. Дзень, месяц, год нараджэньня: 10 кастрычніка 1973 году. Месца нараджэньня г. Калінкавічы Беларусь. Нацыянальнасьць. Беларуска. Адукацыя: вышэйшая, журналіст. Месца працы: "Настаўніцкая газэта", перакладчыца

"По существу (...) вопросов поясняю следующее

... С января 1996 начала работать в "Настаўніцкай газеце" сначала я подменяла штатного работника редакции, а с 17 февраля 1996 г. меня взяли на постоянную работу на должность переводчика. В мои обязанности входит перевод авторских материалов, писем, документов, поступающих из Министерства образования и науки, которые приходят в редакцию на русском языке. (...) Хочу дополнить, что С.Адамович мне на данный момент кажется человеком довольно неуравновешенной психикой. И причины его деятельности в последнее время заложены в неблагополучии его личной жизни. Я не утверждаю это, по крайней мере мне так кажется и казалось во время нашего с ним общения. Несмотря на его хорошее отношение ко мне, добрым человеком я назвать его не могу. Но в то же время, замечу, что по существу он домашний человек и будь у него хоть какая-то определенность в жизни изданием газет, подобных "Лукашенской правде", и созданием националистических организаций он бы не занимался.

Со слов сотрудников "Настаўніцкай газеты" могу лишь сказать, что из данного издания С.Адамович был уволен за свои "взгляды" неприемлемые в упомянутом издании".

З паказаньняў сьведкі па крымінальнай справе №182

Прозьвішча. Старчэўская. Імя: Вольга. Дзень месяц, год нараджэньня 3 сакавіка 1951 году Месца нараджэньня. в. Семежава Беларусь Нацыянальнасьць: Беларуска. Адукацыя. вышэйшая. Сямейная становішча: ***замужам.***

"Вопрос. Дайте пожалуйста, характеристику Адамовича. Ответ: Адамович является своеобразным человеком, характер сложный и неординарный. Отличительной чертой является обязательность и пунктуальность. В коллективе может быть неуживчив. Прямой, может высказать свое отношение к человеку в лицо. (...) Может признать свои ошибки, старается всегда оставаться честным. Прямолинеен

З пратаколаў допыту сьведкі па крымінальнай справе №182.

Прозьвішча. Бялькевіч[?]. Імя. Натальля. Імя па бацьку. Усеваладаўна. Дзень, месяц, год нараджэньня 21 студзеня 1951 году. Месца нараджэньня г. Ленінград, СССР (цяпер Расейская Фэдэрацыя). Нацыянальнасьць. расейка, грамадзянка РБ. Адукацыя вышэйшая, філёзаф. Месца працы: газэта "Знамя юности", рэдактар аддзелу палітыкі і права. Сямейнае становішча: разьведзеная.

"Адамович С.Г., по моему мнению, человек, страдающий манией величия, безосновательно мечтающий о лаврах диктатора. Никаких задатков лидера у него нет. Экстремист, начисто отвергающий понятие народовластия. Ярый националист"

З паказаньняў сьведкі, дадзеных на допыце 16 красавіка 1996 году.

Прозьвішча: Ванковіч. Імя: Галіна. Дзень, месяц, год нараджэньня 28 сакавіка 1971 году. Месца нараджэньня. м. Дрыя, Беларусь. Адукацыя вышэйшая, філёлаг.

"По существу заданных вопросов свидетель показал следующее. (...) В силу своего характера и поведения этот человек вызывает противоречивые чувства: с одной стороны он вызывает чувство жалости, являясь одиноким и не имея настоящих друзей, обладает долей литературного таланта, который мог бы проявиться, направь он его в нужное русло, любит детей. С другой стороны, на мой взгляд, у Славомира присутствует мания величия и мания преследования при комплексе саморазрушения. Такие выводы я сделала, исходя из его поведения, манеры одеваться, разговоров с ним. В частности, примерно через каждые сорок-шестьдесят минут Славомир тщательно моет руки "хирургическим" способом по 15 минут очень горячей водой со щеткой

Хваробачкі

У 4-й камэры я сяджу з 10 ліпеня. І увесь гэты час назіраю павольнае паміраньне чалавека, які назваўся Артурам Караткевічэм. Ён як і я, чакае суда. Інкрымінуюць яму, здаецца, хабар. Былы сьледчы з Барысава, мой аднагодак. Паводле прызнаньняў суседа, бацька ягоны прытрымліваецца левых поглядаў, увесь горад закідаў камуністычнымі улёткамі. Вось адкуль антыфронтаўскія рэплікі гэтага Артура

Зрэшты, яму цяпер да лямпы і левыя, і правыя, і ўсе іншыя. За паўгода знаходжаньня пад сьледзтвам ён нажыў у сырых камэрах запаленьне бронхаў. Сёньня няпачасны ледзь не зайшоўся ад кашлю. Ціск упаў. Выклікалі доктара, які сказаў, што акрамя бранхіту ў хворага назіраюцца астматычныя сымптомы. І нягледзячы на відавочна крытычны стан падсуднага, намесьнік начальніка СІЗО КГБ абвінавaціў Артура ў сымуляцыі. Сёньня ж яго перавялі ў адзіночную і нібыта сушэйшую камэру. І засталося нас двох.

Пасьля сухой галадоўкі са здароўем пачынаюцца праблемы і ў мяне. Адчуваю першыя праявы гастрыту: кісьліня ў роце, адрыжка, цяпло ў жываце, якое, вельмі

магчыма, можа разьліцца пякельным полымем-агнём. П'ю таблеткі "Вікаіру" Прапаў апэтыт.

Вечар, 31 ліпеня. Блізка што чатыры месяцы за кратамі. Прачытаў апавяданьне Джэка Лёндана "Забіць чалавека". З каноўкі твора застаецца незразумелым, ці стрэліла жанчына ў абяззброенага злодзея. Відаць няпроста забіць чалавека. А ворага?..

З мовы сядзельцаў "амэрыканкі"

ГАДОК — аднагодак, у в и ку гадкі салдаты адна о прызыву.

ІЗЬМЕНА — трывожлівы неспакойнь ста арыштаванага. Сядзець на ізьмене - пера жываць, хваляваца. Нэрвовая ліхаманка

КЕШАР — перадача з волі

КІПЕЖ хваляваньне зьнявс іень х у камэрах нэ зоне"

КІЧА — штрафны ізалятар (шызо).

МАЛЯВА цыдулка, інфармацыя, якой абменьваюцца зьняволеныя, знаходзячыся ў розных камэрах ці атрадах альбо перадаюць на волю

ПРАБІВАЦЬ правяраць выклікаць на шчырую размову. На зоне цябе будзе прабіваць "хазяін", вертухай, блатны падсадны стукач. Мэта здабыць інфармацыю.

СІДАР вялікая умка, сума зь якой арыштант вандруе па этапах

СКВО жанчына.

ХЛЯБАЛАВА — бясконцы СІЗОўскі суп як даюць ту раніцай, днем і вечарам.

ШЛЁМКА — жалезная альбо алюмінёвая міска

\+++

Жыць хочацца, бадай што як ніколі
тым больш любіць, тым больш калі вясна
тым больш калі ў цябе дачка на волі
тым больш калі яе у цябе няма...

\+++

Няма куды бегчы, таварыш
закрыты і захад, і ўсход
падпісаны ордэр на арышт,
пастаўлены штамп: "У расход

Настроены вораг рашуча
ды толькі і ты не слабак
і ўголас ты сьмела і гучна
гаворыш пра ўсё што ня так

Але ужо і словау замала
і, значыць настала пара
выходзіць насустрач вандалам
пад сьпеў партызанскіх гармат

29 ліпеня 1996 году

\+++

Не гані пургу*, начальнік
Я табе не крымінал,
я прыгожага шукальнік,
я — пачатак, ты — фінал

Я ірву душу на часткі,
ты вязаць канцы мастак
я унікаю хітрай пасткі на ральлі
як чорны грак

Эх з кайданнага я племя
кантралёр табе імя
мае ногі прагнуць стрэмя
твае рукі — рамяня.

І таму як ні усьміхаися,
як мне ў вочы ні хлусі,
скажа некалі: "Зьбірайся!"
І табе ДэПэНСі**

06 07 96

**Гнаць пургу – хлусіць*
***ДПНСІ – дзяжурны памочнік начальніка сьледчага ізалятара*

Тэстамант

Я, Славамір Генрыхавіч Адамовіч, беларус, 8 сакавіка 1962 году нараджэньня, да арышту пражываў па адрасе: г. Менск, вул. Сурганава, дом 45, корп. 3, паверх 8, блёк 4, абвінавачаны паводле ч. 1 арт. 67, ч. 1 арт. 80 і ч. 3 арт. 213 КК Рэспублікі Беларусі (крымінальная справа №182) і зьмешчаны ў сьледчы ізалятар КГБ РБ

у выпадку маёй гвалтоўнай сьмерці адпісваю (завяшчаю)

Беларускай газэце "Наша Ніва" ў асобе яе законнага прадстаўніка рэдактара Дубаўца Сяргея Іванавіча мой асабісты архіў, які знаходзіцца па вышэйназваным адрасе. Пакой у блёку №4 апячатаны і здадзены на адказнае захаваньне камэнданту інтэрнату ПТВ 24 Шумейцы Ніне Уладзіміраўне (тэл. 32-46-11). Архіў уяўляе сабой рукапісныя і друкаваныя матэрыялы, лісты, фотаздымкі, альбомы, рабочыя дзёньнікі (чарнавікі літаратурныя), папкі з часопісамі і газэтамі, а таксама некаторыя іншыя рэчы, цікавыя для будучага музэю "Нашай Нівы".

Бібліятэку, якая ён ходзіцца на тым ж адрасе, а найперш двухтомнік Ніцшэ і "Хрэстаматыю" М.Гарэцкага 20-х гадоў выданьня, адпісваю Страшэўскай Натальлі, студэнтцы філфаку БДУ

Бытавыя рэчы (ляДоўня, посуд, мэбля, вопратка, інш.) перадаць бацькам.

Гэты тэстамант складзены мною у нармальным фізычным і псыхічным стане 15 ліпеня 1996 году.

15 07 96

Адамовіч С Г (подпіс)

Мяркую, гэты "Тэстамант" можна выкарыстаць у друку. У любым выпадку ён сапраўдны. Усялякае можа здарыцца яшчэ тут, у СІЗО, а тым больш на "зоне", калі мяне туды адправяць. Так што працу распарадзіцца маёй маленечкай спадчынай належным чынам. Гэта калі наш міт атрымае разьвіцьцё ў непажаданым кірунку. Аднак, як падказвае нам інтуіцыя, мы яшчэ пажывем. Ніякіх банальных самагубстваў (падзеньняў у пралёт лесьвіцы павешваньняў, самастрэлаў, харакіры)! Жыць! Каб таварышу пракурору жыцьцё мёдам не здавалася і проста так каб дзяўчыначку кахаць

17.06.96

Дакумэнт №1

Следователю по особо важным делам СО КГБ РБ капитану юстиции Сокольчику А.П.

Справка

о судебных издержках по уголовному делу №182

Судебные издержки по уголовному делу №182 по состоянию на 17 июня 1996 года составили

1. На оплату труда адвоката (Цьветова С.А.) 106 814 рублей,
2. Стоимость проведенных экспертиз
- №880 от 13 марта 1996 года — 850 000 рублей,
  №1050 от 29 марта 1996 года 425 000,
  №1470 от 23 апреля 1996 года 425 00 рублей,
  №1465 от 3 мая 1996 года — 667 000,
  №254 от 1 мая 1996 года — 1 500 000 рублей

Всего: 3.873.814 (три миллиона восемьсот семьдесят три тысячи восемьсот четырнадцать рублей).

Начальник ФЭО КГБ РБ (пячатка, подпіс)

полковник Г.М.Кукушкин

Дакумэнт №2, копія

Направляется на рассмотрение жалоба Драбкина Э.Б. по делу Адамовича С.Г. для проверки изложенных в ней фактов. О принятом решении просьба сообщить заявителю

Решение: на 1 л.

Нач. отдела (управления)

(подпіс неразборлівы)

Дакумэнт №3, копія

С огромным удовольствием узнал из печати, что прокуратура занимается делом Славомира Адамовича (Правый реванш)

Пишу Вам специально, чтобы подчеркнуть для Вас некоторые моральные качества этого графомана. Я учитель. Более тридцати лет выписывал "Настаўніцкую газету", но прекратил это делать после того, как она опубликовала ряд статей члена редколлегии Адамовича. Если захотите увидеть облик этого ублюдка, пусть редакция предоставит его три статьи, опубликованные в разное время: "Реминисценции о параде" — на День освобождения — какое кощунство — Белоруссии от фашистов (какие партизаны — бандиты, какие честные люди — немцы!), "Текст №5 "Паша і Будслава" (сплошные "жиды, жидовки и жидовочки"), "Пяць дзён на усходняй граніцы" (дикая нечеловеческая звериная русофобия).

В свое время я выразил свое негодование этими материалами. Меня поддержала редколлегия "Советской Белоруссии", которая, выказав свое возмущение, обратилась (с моим письмом) к министру просвещения. Но — увы, редакционная коллегия "Настаўніцкай газеты", собравшись по указанию министерства, подтвердила правомочность этих публикаций. И это в "Настаўніцкай газеце", занимающейся вопросами воспитания молодежи.

В письме, направленном в министерство "Советской Белоруссией", были слова: "Публикации, которые по меньшей мере не делают чести ни вашему министерству, ни вашей газете". Но еще мягко сказано.

Рад, что времена изменились, что в наше время можно "раздать каждой невестке по серьгам".

Так что известный Вам Славомир Адамович — это не только "Убей президента!"

Буду счастлив, если то, что я Вам сообщил, хоть в какой-то степени пригодится (хотя мой сын убеждает меня, что раз так долго ему позволяли публиковать эту всю мразь — за спиной у него кто-то есть!)

С уважением Драбкин Эдуард Борисович (Гомель)

20.IV. 96 г.

Драбкін-малодшы мае рацыю: у мяне сапраўды "кто-то есть", толькі хутчэй не за сьпіной, а пад нагамі — гэта мая беларуская зямля. Вось яна і дае сілы, і гэта ёй я сплочваю доўг словам, як магу, за радасьць папіраць сваім 41-м памерам чаравіка золата лістоты сініх лясоў, жвір дарог, асфальт вуліцаў, бэтон турэмнай камэры...

Неха Драбкін Э.Б. у свой час настаўнічаў у Будслаўскай сярэдняй школе, што на Мядзельшчыне. У гэтай жа школе працавала Паўліна Мядзёлка. У Будслаўскую дзесяцігодку пяць гадоў праціраў і я; тут жа, у даўнім-прадаўнім Будславе, я сустрэў сваё першае плятанічнае каханьне — дзяўчыначку Лолу, жыдовачку. Праз 20 гадоў у "Настаўніцкай газэце" я апублікаваў нязвычны паводле жанру тэкст пра сваё першае дзіцячае захапленьне. Вось тут і ўзьнік Драбкін з усім тым на душы сваёй старэчай, пра што можна здагадацца, прачытаўшы ягоны ліст.

Уся сям'я сядала каля радыёлы і слухала "Вольную Эўропу"

Гутарка зь Віктарам Шалкевічам

ня"). Пачалося заглыбленьне ў гісторыю, гульня ў маскі. У студыі беластоцкага радыё В.Шалкевіч сёлета запісаў альбом са сваімі песьнямі "Смутны беларускі блюз". На вокладцы зноў жа матэйкаўскі на каралеўскім троне блазан зь Віцевым тварам. Дарэчы, "Салодкі яд каханьня" здымалі ў Міры і Нясьвіжы. Пра некалі славуты горад у яго ёсьць песьня: "Дзе тваё Магдэбурскае права, дзе твае Радзівілы, Нясьвіж? Закапіліся гонар і слава, на мінулым пастаўлены крыж".

Нямыя набылі голас

– Калі ўсё так кепска, ці ня думаў ты ўсё кінуць і зьехаць у якую-небудзь нармальную краіну?

Наша краіна нагадвае мне біблейскія часы, калі пачынаюць уваскрасаць нябожчыкі, калі ў міліцэйскіх пастарунках нямыя пачынаюць гаварыць і даваць паказаньні. Толькі Хрыста пакуль няма і хіба яшчэ доўга ня будзе. Але ў людзей ужо пачалі расплюшчвацца вочы на тое, што робіцца у Беларусі. Лк дз сталі, як мне здаецца, вельмі хутка мудрэць. Мне няёмка, брыдка за тое, што ў нас робіцца на фоне таго, як усе суседзі ідуць наперад. І тым жа часам я жыцьцё ў нашай краіне ні на што б не прамяняў. Я тут маю сваё месца і выдатна сябе у ім адчуваю.

Быць беларусам няёмка

Шалкевіч — чалавек тутэйшы заходнебеларускі, ды яшчэ тэатральны актор, таму ён можа пабыць ня толькі ў шкуры немца. Самавызначэньне яго сапраўды было стракатае. выразна не хацелася называцца савецкім чалавекам бяз адрасу і вуліцы. Было гэта прыблізна так.

У 39-ым Чырвоная Армія вызваліла маё роднае мястэчка Поразава. Прыйшлі Саветы і давай агітаваць у беларусы. А у нас заўжды існавала розьніца паміж каталікамі і праваслаўнымі, якія мелі толькі адныя нагавіцы, пазалі на бярозкі, выглядаючы Чырвоную Армію, размахвалі чырвонымі сьцягамі. Вось жыхары Поразава адмовіліся: мы маўляў палякі.

Калі цяпер касьцельныя пачалі перапісвацца ў палякі, я ў іх пытаюся: а хто вас прымушаў запісвацца беларусамі? Яны тадь мне локшыны на вушы вешаюць, што беларусам лягчэй было ў інстытуты паступаць. А чаму ж вы ў касьцел толькі цяпер пачалі хадзіць? Бо няможна раней было, адказваюць. А я хадзіў. Прыніжацца робіцца звычкай.

Польскасьць як форма апазыцыі

Мы выхоўваліся ў сваім Поразаве за 20 км ад польскай мяжы на традыцыях каталіцкасьці і нейкай прыблізнай польскасьці. Мае бацькі не прымалі афіцыйнай беларускай культуры. Мой бацька гаварыў: во — лыгачы і зьвяртаўся да нас, братоў: "Віцю, Юрэ ці Стась, пашукайце "Вольнай Эўропы"". Я ніколі не забуду, як браты аднойчы прыцеглі на санках радыё "Урал-57" зь зялёным вочкам настройкі. Мы ўсёй сям'ёю сядалі вакол яго і слухалі польскую радыёпраграму з Мюнхена. Беларус у нашым уяўленьні быў чалавекам, які любіць камуністычную партыю, правіцяльства, потым радзіму і імкнецца забыць сваю мову, каб трапіць у камунізм.

Ліцьвіны яшчэ існуюць?

Калі я прыехаў у Менск вучыцца, я адчуў сябе страшэнным палякам. Хадзіў на кальварыйскія могілкі, гэта было адзінае месца ў гэтым савецкім горадзе, дзе мая душа супакойвалася. А потым сустрэўся зь людзьмі, якія на ўсё жыцьцё памянялі мае погляды. Апошнюю кроплю у гэтую бочку аднойчы дадаў мой бацька. У нас дома быў Міхась Раманюк. Ён даказваў, што мы – беларусы, а я, што палякі. А бацька стукнуў кулаком і сказаў, што мы – ліцьвіны.

Сапраўды, нас так называлі палешукі з суседняй вескі: во ліцьвіны прыйшлі.

Салота касіць.

— А яны не лічылі сябе, скажам, украінцамі?

Не, ні ў якім разе, я такога ніколі ня чуў. Для мяне вельмі дорага, што ўсе мы – нашчадкі жыхароў Вялікага Княства Літоўскага, я сябе такім адчуваю і сёньня.

— Як Чэслаў Мілаш?

— як Вітольд Іваноўскі (наш агульны сябра, які ажно 25 гадоў ад Хрушчова да Гарбачова быў гарадзенскім карэспандэнтам "Звязды". Ягоны прадзед удзельнічаў на баку паўстанцаў у боі пад Мілавідамі. С.А.)

Паўстанцкі Хрыстос

Дарэчы, я ад старых людзей чуў, што далучыцца да паўстанцаў Кастуся Каліноўскага (Віктар — ягоны зямляк. С.А.) называлася "пайсьці ў палякі". Іхні пункт збору быў непадалёк – каля вескі Студзенікі. У Поразаве на могілках ёсьць дзьве магілы паўстанцаў Яна Дмухоўскага і Казіміра Шалкевіча. Простыя помнікі з каменьня і вялікі гранітны крыж.

За маёй вуліцай Якуба Коласа (былой Я.Пілсудзкага) на ўзгорку стаіць капліца, пабудаваная ў гонар кагосьці

з паўстанцаў. Саветы яе разбурылі, а нядаўна людзі зноў аднавілі капліцу. Здарылася гэта ў 60-ыя гады. Расказвалі, што разьбітага гіпсавага Хрыста зь яе знайшлі потым пастухі. Гісторыя паўтараецца. А ў мяне напісалася рамантычнае апавяданьне, якое ты ведаеш і якое мала хто чытаў. "Дзьве сьмерці Сыльвэстра Лаўрыновіча". Яно пра тое, як вясковага пробашча выклікалі да хворага паўстанцкага камандзіра, і як ён застаўся з паўстанцамі і ўзначаліў іх. Але атрад быў разьбіты, а ён загінуў.

Задума апавяданьня была навеяна тым, што я хадзіў на старыя могілкі, стаяў каля магіл і капліцы, уяўляў. Самае цікавае ў гэтым жыцьці якраз тое, што мы выдумваем. Я выдумаў, але гэта набыло рэальныя рысы. Я кінуў пісаць прозу. Атрымаў прэмію за лепшы дэбют у часопісе і зразумеў, што гэта рабіць я таксама ўмею. Працягваю пісаць вершы, песьні. Я вадалей і шукаю новага, каб зрабіць усё, што хачу.

— Проста скончыў з прозай і ўсё? Выпадак нестандартны: празаік стаў паэтам...

– Жыцьцё складанае пачалося. А каб нешта закончанае напісаць, трэба, каб ніхто табе не перашкаджаў. Вось чаму ёсьць дамы творчасьці, чаму людзі ўцякаюць на вёску. Але я нічога не выкідаю. Шмат чарнавікоў – і ўсе захаваныя. Мая жонка крычыць. Аднак я ведаю, што заўжды змагу вярнуцца да задумы і ўвасобіць яе. Я не выпускаю кніжак, але затое маю ўжо два магнітальбомы з уласнымі песьнямі. Мне здаецца, што гэта нічым ня горш за кніжкі.

У нашых умовах пакуль твае апавяданьне дойдзе да чытача, міне шмат часу. З песьнямі гэта адбываецца хутчэй. А тым больш я заўсёды азіраўся назад: ці ня едзе за мной вершнік на срэбным кані з касою у

руках. Гэта падганяе. Пакуль яго няма, але ўсё адно хочацца пасьпець у жыцьці зрабіць болей.

Басовішча

Дагэтуль некаторыя айчынныя сьпевакі едуць на ўдачу да Масквы. Шалкевіч, наадварот, накіраваўся ў Эўропу, але далёка не заехаў — перабраўся на другі бок мяжы, зрабіўся песьняром Беласточчыны. Вось што ён сам пра гэта думае.

– Посьпех прыходзіць тады, калі ты нейкім чынам выказваеш свае думкі, якія, на вялікае шчасьце, зьяўляюцца думкамі вялікай колькасьці людзей. І гэта атрымалася са мной не ў Беларусі, дзе на мяне шыкалі ня раз і гаварылі: зрады эта пішаш такое, нехарашо. На Басовішча я прыехаў аднойчы мала знаным бардам, а выйшаў зоркай. Мяне ўсе добра там зразумелі, у мяне адразу выраслі за сьпінай шэсьць параў крылаў. Я стаў многа пісаць і дабіўся на Басовішчы Gran-prix, права бясплатнага запісу сваёй касэты у беластоцкай студыі Польскага радыё з удзелам майго ансамблю, што я і зрабіў.

Я люблю Беласточчыну, яна – частка маёй душы. Бываю ў тых мястэчках, мне здаецца, што завярну за дом, а там мая хата, маці сядзіць. Я ніколі не праводзіў мяжы паміж Беласточчынай і Гарадзеншчынай: гэта адзіны непарушны рэгіён. Нам усё крычаць, што мы з рускім народам брацьця, а што з палякамі мы хіба не браты?

Сны пра Беларусь больш ня сьняцца

Я ўжо гаварыў пра "Урал-57". Дзякуючы яму я слухаў Варшаву, палюбіў песьні Сэвэрына Краеўскага, Чэслава Немана, Тадэвуша Возьняка, Марэка Грэхуты. Яны больш сьпявалі аб чалавечых пачуцьцях, тым часам як зь Менску даносіліся аднолькава бадзёрыя сьпевы пра "нашу долю шчасную, родную калгасную".

Сёньня для мяне ёсьць блізкія і сярод беларускіх бардаў. Андрэй Мельнікаў, якога я называю апошнім шляхціцам Вялікага Княства на ўсходніх рубяжах Рэчы Паспалітай. Нейкі храніст калісьці з жахам апавядаў пра дробную беларускую шляхту, якая сама басанож возіць гной, але мае шаблю пры сабе – на ўсякую прыгоду. Ён мне чымсьці нагадвае такога шляхціца.

Потым мне падабаецца яшчэ адзін досыць малады гомельскі бард Дзіма Бартосік. Ёсьць таксама цікавы сьпявак у Жодзішках (Смаргонскі раён) Алег Мізула. Пачало нешта сур'ёзнае нараджацца і на вельмі нармальным узроўні. Скончыліся песьні пра тое, што нам сьняцца сны аб Беларусі.

Габрайскія сьпевы

Шалкевіч да ўсяго яшчэ і сьпявак гарадзенскага габрайскага ансамблю. Большасьць ягоных сымпатыкаў успрымае гэта зь цікавасьцю, некаторым жа песьні пра шахер-махер і шлягер пра самавар на ідыш вельмі не падабаюцца, выклікаюць скрыўленыя ўсьмешкі і зьедлівыя жарты. Але Віця — шматколерная асоба, яго цікавіць усё.

– Мода на габрайства існуе, яна ідзе з Масквы. Мне гэта таксама цікава. Наш ансамбаль граў толькі габрайскую музыку, а калі прыйшоў я, дык сталі выконваць і польскія, беларускія песьні, расейскія рамансы. Я не прафэсійны музыкант, таму заўсёды любіў прафэсійных музыкантаў, яны для мяне самыя цікавыя людзі. Мне зь імі вельмі камфортна. Я люблю зьмяняць абставіны і бываць сярод розных людзей. На першым габрайскім фэстывалі ў сталіцы мы выглядалі вельмі каларытна. Усе астатнія дасталі нейкія кніжкі, сьпеўнікі і не адрывалі ад іх вачэй, мы ж выступалі весела, сьпявалі жартаўлівыя песьні.

Драўляны малаток

У Горадні Шалкевіч добра вядомы таксама як чалавек, які прадаў на аўкцыёнах дзясяткі крамаў, дамоў, кватэр, спрабаваў прадаць лазьню. Аляксандар Маліноўскі – супрацоўнік гарадзкога аддзелу прыватызацыі гаворыць: можна знайсьці лепшага за Шалкевіча аўкцыяніста, можна — горшага, але такога як Шалкевіч ня знойдзеш.

– Ён мае ў нечым рацыю. Гэта толькі здаецца, што праца вельмі лёгкая. Я ўжо спрактыкаваны, правёў каля 40 аўкцыёнаў па ўсёй Беларусі. Але колькі нэрваў гэта каштавала! Цяжэй за ўсё было, аднак, напачатку, я быў адным зь першых. Калі будзе вялікі суд, дык мне скажуць, колькі я ўсяго прадаў, сам я не лічыў, але думаю, што гэтага ня здарыцца...

Шалкевіч, натуральна, выйграе тым, што ён і паводле адукацыі, і паводле схільнасьцяў — актор, прычым хутчэй камэдыйны. Таму ён можа выйсьці на трыбуну з драўляным малатком з чырвоным бантам на штрыфэлі і ў славутай кепцы павіншаваць бізнэсмэнаў, картавячы, з рэвалюцыйным сьвятам, заклікаць купляць маёмасьць і ўключыць для публікі да болю знаёмы Інтэрнацыянал. Ён можа, зьмяняючы маскі, выступіць у некалькіх ролях у "Тутэйшых", напісаць для спэктакля песьню, якую беластоцкае радые спачатку перадасьць, а потым забароніць па просьбах слухачоў, абражаных радкамі "залязлі сабакі, прыехалі палякі і скора стала тых палякаў як сабак".

Побач з амбонам

Мабыць мая задача была зацяжкая – расказаць пра чалавека, пра якога досыць шмат ведаеш. Напрыклад, Шалкевіч — працаўнік першай у БССР польскай радыёпраграмы, дэкляматар Міцкевіча на першых польскіх вечарынах. Шалкевіч дапамагае ксяндзу праводзіць у Фарным касьцёле першыя беларускія набажэнствы, чытае з эвангэльля сваім добрым акторскім голасам. Ва ўжо згаданай песьні пра Нясьвіж есьць наступныя радкі: "Зайсьці ў касьцёл, на лаву ціха сесьці, Ружанец за памерлых згаварыць. За воканамі касьцельнымі дрыжыць старое радзівілаўскае неба, як дзьвесьце-сто гадоў таму. Чаму ты так далёка?"

Што датычыць маіх адносінаў да касьцёла, царквы, мне падабаюцца храмы, падабаецца ступаць па каменных плітах і адчуваць, што па іх калісьці хадзілі мае дзяды і прадзеды. Але мне не падабаецца тое, што ксяндзы часам пачалі ператварацца ў Крыловых і Ляфантэнаў, якія адыходзяць ад рэальнага жыцьця, пачынаюць апавядаць байкі.

У мяне ёсьць пэўная складаная маральная праблема, я прыходжу у касьцёл і хачу дазнацца, як мне яе вырашыць. Мае бацькі заўсёды хадзілі раіцца да ксяндза. Касьцёл, па-мойму, гэта перадусім дзеяньне, дапамога. Выходзіць па сьвятах з харугвамі і крапіць сьвятой вадою – гэта яшчэ ня ўсё. Пакуль касьцёл стаў займаць у маім жыцьці менш месца. Паглядзіш: каталікі каталікі, а як галасаваць, дык галасуюць як звычайныя савецкія людзі.

Сяргей Астраўцоў

Занатоўкі эгаіста

Адам Глебус

Індыйская сучаснасьць

Індыя — край чырвонага пылу. Індыя — царства гліны і белых кароў. Індыя край зялёнай вады, глухіх сьценаў і шэрых людзей.

Як толькі мой самалёт прызямліўся ў Дэлі і адчыніў дзьверы, у горле запяршэла і запякло. Вапняковы пыл і распаленыя газы ўварваліся й разьліліся ў лёгкіх.

Над Дэлі вісела воблака фіялетавага смогу. У вачах зьявілася рэзь і сталі сьлёзы.

Індыя не вітае падарожнікаў. Індыя не заўважае каланізатараў і чужынцаў. Індыя, як Кітай і Расея, не дзяржава, а ўшчэнт састарэлая цывілізацыя.

Я ступіў на гарачы бэтон аэрадрому і пабачыў безьліч трапаў з надпісам KAZAHSTAN.

На беразе цэмэнтавага пляцу ўзвышаліся гурбы пяску і каменьня. На іх сядзелі канчаткова худыя шэраскурыя людзі. Яны ветліва дэманстравалі зубы, па якіх можна было здагадацца пра ўзрост і пол. Лётчык сказаў, што гэта тамтэйшыя будаўнікі. Я паверыў яму толькі тады, калі да будаўнікоў прыехаў на ровары яшчэ адзін індус ў чалме і раздаў прывезеныя на прычэпе шуфлі. На пабітым іржою рулі зіхацеў чырвоны сьцяг.

Індыя парушыла каставую сыстэму, а сацыялізм не прывіўся на яе тэрыторыях.

Змучаны пылам і сьпекаю я вярнуўся ў самалет, дзе мяне сустрэлі два нізенькія мужчынкі у памечаных пінжачках. Адзін сказаў, што тут Індыя, што ён boss і я вінен пяць даляраў. Паказаўшы на падлогу салёна, я прамовіў груваасткае BELARUS. Паліцыянты папрасілі адзін даляр. Толькі просьбы іх былі марныя.

Лётчык запэўніў, што ўсе індусы такія.

Калі самалет узьляцеў над Дэлі, я не глядзеў у ілюмінатар.

Індыя — цывілізацыя мінуўшчыны і будучыні. Індыя — абшар жудаснай сучаснасьці.

Чарговы конкурс безь пераможцаў

Сяро. той пошты, якую мы атрымалі, ізноў ніводзін з карэспандэнтаў ня здолеў адказаць слушна на ўсе пытаньні запар. Праўда, усе ўдзельнікі конкурсу зрабілі толькі па адной памылцы! Пры гэтым усе разам здолелі разабрацца ў загадках. Па-просту не было першых на фінішы. Бліжэй за ўсіх да перамогі былі Сяргей Грыніцэвіч зь Вялейкі, Андрэй Коржыч з Гомеля, Віктар Мухін зь Менску — усе сталыя карэспандэнты "НН".

С.Грыніцэвіч памыліўся ў чацьвертай загадцы, прыняўшы Гомель за Магілёў. Для большасьці самым складаным стаў другі здымак, гэтак і А.Коржыч пераблытаў Вільню зь Віцебскам, а В.Мухін прыняў Вільню за... Валожын. Усім вялікім посьпехаў у наступны раз.

1. Полацак. На здымку: панарама з боку Дзьвіны зь відам на Мікаласаўскі сабор (раней — касьцёл Сьв. Сьцяпана) з колішнім кляштарам езуітаў і Барысаглебскай брацкай царквой з манастыром. Гэтая загадка ні ў кога ня выклікала сумневу, не зьбянтэжыла нават адсутнасьць у полі здымку сабора Сьв. Сафіі. Полацак ёсьць Полацак. Дзе б хто з нас ня жыў, ці ў Жыткавічах ці ў Мазарыне, Полацак паўсюль зь ім.

2. Вільня. На здымку: Ратушовы пляц. Паўтаруся, гэтая загадка стала самай складанай. Між тым, Ратушовы пляц неадрыўны ад гісторыі нашай краіны. Дастаткова сказаць, што на ім і сёньня стаіць палацык віленскага бурмістра Якуба Бабіча, у якім Францішак Скарына выдаў сваю першую кнігу. На здымку зьлева — кляштар і калегіюм езуітаў — саборам Сьв. Казімера, які спраектаваў славыны беларускі дойлід, зь Менску родам Ян Франкевіч. Пра тое, хто тут жыў, мінаў гэты пляц, пра тое, што адбывалася тут, можна было б напісаць ладны том. Шчыра ўдзячны тым, хто даслаў нам слушныя адказы. Вільня і надалей будзе непазьбежна прысутнічаць на старонках "НН" і ведома ў нашых конкурсах.

Яшчэ адзін віленскі сюжэт падказвае нам С.Грыніцэвіч (ён дарэчы, назваў места, выяўленае на здымку): "...У раёне, які я абслугоўваю (я працую лекарам), дажывае свой век Ніна Аляксандраўна Лявіцкевіч. Амаль усе жыцьцё яна пражыла ў Вільні, дзе працавала ў аддзеле рэдкай кнігі Акадэмічнай бібліятэкі. Зь яе словаў, яна ахвяравала сваю багатую бібліятэку музэю М.Багдановіча і Нацыянальнай бібліятэцы ў Менску. Засталося аднак у яе яшчэ нямала кніг з аўтографамі дзесятка беларускіх літаратараў. А сёньня пра яе забыліся. Да апошняга часу яна ўсе перабірала свае архівы, хацела дапрацаваць нечую бібліяграфію. Ёй ужо 84 гады і яна амаль нічога ня бачыць. Можа хто яе памятае? Бо ў Вільні ў яе бывалі і Конан, і Мальдзіс, і Ліс, і Саламевіч, і Мархель..." С.Грыніцэвіч даў на нашай рэдакцыі адрас гэтай жанчыны.

3. Менск. На здымку: Саборная плошча з боку колішняга кляштару базыльянаў. "...Тым, хто хоць раз бываў на гэтым месцы, адразу яго пазнаюць: і гэты будынак, і кавалак краявіду, нягледзячы ні на што, не зьмяніліся за апошнія сто гадоў. Сам жа будынак пабачыў нямала за гады свайго йснаваньня. На пачатку гэта была двухпавярховая камяніца базыльянскага кляштару, які пасьля перарабілі на праваслаўны манастыр Пятра і Паўла. Пасьля пажараў і перабудовы, на якіх будынак быў рэканструяваны пад мужчынскую гімназію менскім губэрнскім архітэктарам Хрышчановічам. Затым тут былі прысутныя месцы. У такім выглядзе з канца XIX ст. гэты дом і пляц перад ім дайшлі да нас безь зьменаў... Толькі цяпер гэта зусім ціхае і малалюднае места", — піша ліцэіст зь Менску Віктар Мухін. Сёньня гэты дом належыць прафсаюзам, залежным і незалежным. На жаль, мала хто бачыць мэмарыяльную табліцу на ягоным муры, дзе згадваецца, што тут вучыліся Тамаш Зан, Аляксандар Ельскі, Антон Трусаў ды яшчэ ладны тузін тых, хто са сьценаў гэтае гімназіі выйшаў у шырокі сьвет, уславіўшы нашу краіну. Чамусьці большасьць удзельнікаў конкурсу на гэта не зьвярнула увагі. Згадвалі Калініна...

4. Гомель. На здымку: Трэк Гомельскага Пажарнага Таварыства. Гэты здымак таксама многіх зьвёў з тропу, але толькі ня гомельцаў, якія даслалі слушныя адказы. А.Коржыч дадае: "...Многія дзівяцца, што такія прыгожыя штукі маглі быць на месцы цяперашняга цэнтральнага стадыёну "Гомсельмаш", на якім сёньня буяе пустазельле". Шмат прыгажосьці было калісьці ў Гомелі. Дастаткова зірнуць на здымкі павільёнаў і скульптураў старасьвецкага парку Паскевічаў, і сьцісьнецца сэрца ня толькі ў тых, хто жыве сёньня ў гэтым горадзе. А стадыёны, трэкі і іпадромы Менску, Магілёва, Горадні, нашых малых і вялікіх мястэчак сапраўды выглядалі дзівяцаста гадоў таму ідылічна, бо тады ні ў кога не было яшчэ задачы ляпіць "новага" чалавека, які пасьля мусіў удзельнічаць у максымальна масавых спартовых і палітычных урачыстасьцях. На спартовыя пляцоўкі прыходзілі адчуць заздровых эмоцыяў, якіх не адчуеш без прыгажосьці ўсяго, што атачае тут чалавека, — архітэктуры, прыроды, музыкі.

5. Горадня. На здымку: Мужчынская гімназія на Саборнай вуліцы. Слова гарадзенцу А.К...рою: "...Гэты будынак узьведзены ў 1735 годзе як школа пры кляштары дамініканаў. З 1885 да 1915 тут працаваў выдатны беларускі гісторык, краязнаўца і педагог Яўстафі Арлоўскі. У гэты ж час тут вучыўся будучы атлет Якуб Чахоўскі, ня ўсе рэкорды якога пераўзыдзеныя і сёньня (пераносіў у адной руцэ рэйку з насьцю людзьмі). Гарадзенскую традыцыю Чахоўскага працягвае зямляк Алесь Курлеўіч". Ну што яшчэ тут дадаць? Хіба вось гэта: "...мы з жонкаю адразу ж пазналі на апошнім старонцы Горадню — улюбёны горад і горад нашага каханьня. На старым здымку — былая вуліца Саборная, вядомая з XIV ст. як Віленская, пасьля Дамініканская, а з 1940 году — Савецкая, якою, на жаль, і засталася..." — піша А.Коржыч, карэнны "гамельчанін", як ён сябе адрэкамэндаваў.

Шліце нам лісты, распавядайце пра ўсё, што лічыце патрэбным, бо гэта вельмі уважлівыя. Перамогі будуць за Вамі. За намі — прызы.

Сяргей Харэўскі

НАВІНКА

Споведзь стомленага чалавека

"Уліс". Блуканьне. "Кэнсс". 1996

"Уліс" працягва блукаць. Новы альбом гурта паказвае адпаведныя падрыхту. Лідар Слава Корань выступіў аўтарам усіх тэкстаў. Яны прасьцей і гутарліцы, і вельмі шчырыя: "Пудзея", "Бяз ім месцы", "Споведзь стомленага чалавека", "Усё адносна", "Цемра" — вось некаторыя назвы песьняў, якія могуць патлумачыць панаванне настрою ў гэтым альбоме.

Музыка "Уліса" падзяжала — "блуканьне" адбываецца ў жорсткім драйве. Пры гэтым традыцыйная уліс-аўская мэлёдыка захоўваецца. Альбом вельмі эмацыйны, вакал часам задае музычную плынь. Бывае, гэтыя "навальвацца" у найвышэйшую рэня спынць напругу, але гэта ўжо немагчыма, і ён застаецца крыху "збоку".

Вакальныя посьпехі Славы Кораня бясспрэчныя, але таксама заўважна, што ён пакуль скаваны перад мікрафонам. Гэта выклікае пачуцьцё дыскамфорту на тле натуральнае й ладнае музыкі. Зь іншага боку, можна меркаваць пра вялікую патрабавальнасьць Славы да слухача, пра тое, што сэнсу словаў надаецца першае месца, таго аўтар сваедзамі насьці... я стамуся бадзь на... пасьля ўздых, я стамуся бадзь на ... сёньня ёсць для краіны, ... эдэрская як ... нашы Паґоня"...

Калі памятаеце, рок-гурт на фэстывалі "Магутны Божа" быў забаронены пасьля праслухоўваньня "Уліса". Тады песьня "Вышэй і далей", якая завяршае гэты альбом, была адрэдагаваная ў "бездухоўнасьці". У ёй ёсьць такія словы: "Ты абудзіў у нас нашу тугу прагнаў і надзею даў".

Зьменлівае стомленае блуканьне "Уліса" — сьветлае й прасякнёнае. Надрыў, крык у ім — вызваленьне. Вызваленьне ад стомы й блуканьня "Уліса" — падарожнік, а гэта значыць, ён ведае, куды рушыць далей.

Севярын Квяткоўскі

... праваслаўная царква за часамі імпэрыі панавала ў Беларусі. У пачатку XX ст. царкоўнае быў выкрышталізаваны і ўласна праваслаўны стыль, які замяніў сабою ... пераабудовы рэнэсансавых і барокавых бажніцаў, і халодны правінцыйны клясыцызм, і няздужаная апэляцыі да расейскіх узораў.

Большасьць праваслаўных бажніцаў будавалася ўжо ў псэўдарускім духу, але з актыўным выкарыстаньнем новых тэхналёгіяў, якія зьмянілі царкоўны вобраз да мажнай ігрунасьці, стадычнасьці тоўстых сьценаў і цяжкіх купалоў дадаліся пругкасьць і ажурнасьць. Колеры беларускай цагельнай гліны і каменьня надалі гэтым бажніцам духу самое Беларусі. На пачатку стагодзьдзя будавалі, апічаджаючы старыя краявід, ці не таму праваслаўныя цэрквы гэтае пары глядзяцца як імпазантныя ўсходні дадатак да нашае спадчыны, слаба зь ёю зьвязаны, але ўжо й не чужы.

Не чужым стала і самое праваслаўе, якое сто гадоў накідалася брутальным чынам на наш народ і нарэшце стала неадрыўнаю часткай беларускага мэнталітэту праз новыя генэрацыі сьвятароў-беларусаў, дойлідаў і ўрэшце, тых цесляроў і муляраў, дзякуючы якім паўставалі новыя цэрквы, што ня мелі тутэйшых прататыпаў, але адраджалі бясконца далёкія паўлегендарныя формы. Гэтак праваслаўная царква атрымала ў нашым краі творчы патэнцыял людзей, якія, слаба ведаючы традыцыю, адчувалі яе духам.

Конкурс 2

ЯКОЙ ВЕРЫ?

Тое, што на здымку праваслаўная бажніца, зразумець няцяжка, але трэба адказаць, дзе яна знаходзіцца і калі была пабудаваная. Дадам: гэта адна з найбуйнейшых цэркваў таго часу і самая вялікая, з пабудаваных у пачатку XX ст. у нашым краі. Спадзеючыся на Вашую дасьведчанасьць, чакаем слушных адказаў.

Сяргей Харэўскі

Паштовая скрынка

Адасю К. з Кобрыну і В.Г.-Я. зь Менску. Вашы "рубцыстык"... больш ... у ... і пажаданы — у першым ... нумары.

Ведзьмаку Німіжскаму. ... ... недасланыя ... ... дзякаваць, трэба, каб яно было ...

Ц.Г. з Мар'іна ... С.Адамовіча "Убіж ... "прагрэсу" ... Мы ... ня можам, бо ня маем.

Валерыю Г. зь Менску ... ня ... "Залатарагаўя".

НАША НІВА. Стаўка на "Нашу Ніву" абавязковая. Наклад 5100. Нумар падпісаны ў друк ... 1/9/1996. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 4948 ...